Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ЖНІЎНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 158
(26516)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ: ЁСЦЬ 2 МІЛЬЁНЫ ТОН!

Працаўнікі Мінскай вобласці 23 жніўня 2009 года сабралі два мільёны тон хлеба новага ўраджаю. Убрана 90 працэнтаў пасяўных плошчаў збожжавых і зернебабовых культур. З кожнага гектара атрымана па 38,6 цэнтнера збожжа. Выкананы дзяржаўны заказ здачы збожжа дзяржаве. Гэтыя дасягненні — вынік умелай арганізацыі вытворчасці, прымянення прагрэсіўных тэхналогій, паўсядзённай напружанай працы шматлікага атрада людзей, якія з гонарам нясуць высокае званне хлебароба.

Прыемны ліст

## «РАДАСЦІ МАЁЙ І МАІХ СУСЕДЗЯЎ НЕ БЫЛО КАНЦА»

***На працягу некалькіх месяцаў на кантролі ў рэдакцыі газеты знаходзілася праблема, узнятая жыхарамі Мінскага раёна. А канкрэтна — адносна магчымага адключэння падчас гэтага ацяпляльнага сезона ад цэнтральнага ацяплення індывідуальных карыстальнікаў, што пражываюць у аднакватэрных і блакіраваных дамах. Скаргі да нас паступілі, у прыватнасці, з вёсак Сёмкава і Анаполь, хоць, як мы высветлілі падчас нашага своеасаблівага расследавання, у падобную сітуацыю трапілі і жыхары іншых населеных пунктаў Мінскага раёна.***

Якія жарсці кіпелі! Яно і зразумела: гаворка ішла пра тое, каб грамадзяне ўсталёўвалі сабе індывідуальныя крыніцы цяпла. Эмоцыі заяўнікаў часам «зашкальвалі», людзей не задавальнялі ніякія тлумачэнні. Нядаўна мы паведамілі, што да меркавання насельніцтва прыслухаліся. Прынамсі, гаворка ішла пра тое, што сёлета па многіх індывідуальных спажыўцах была перагледжана сітуацыя і прынятыя рашэнні аб падаўжэнні іх цэнтралізаванага цеплазабеспячэння. Днямі мы атрымалі ліст, які пацвярджае гэта.

*«Паважаная рэдакцыя! Я і мае суседзі шчыра дзякуем вам за тое, што з вашай дапамогай мы можам спакойна чакаць зіму: у нас у гэтым годзе не адключаць цэнтральнае ацяпленне. Гэта толькі дзякуючы вашаму неабыякаваму стаўленню да людскіх праблем, вашай руплівасці, стараннасці, шчырай працы.*

*Вашу газету я выпісваю даўно і вельмі люблю чытаць яе. А цяпер і суседку ўгаварыла выпісаць «Звязду», бо газета вельмі цікавая, шмат каму дапамагае, калі людзі звяртаюцца да яе з якой праблемай.*

*Вось і я вырашыла звярнуцца да вас са сваім пытаннем, якое было надрукавана ў газеце за 11 чэрвеня. Прачытаўшы «Пытальнік», была вельмі ўдзячная вам за тое, што вы так многа працавалі, звярталіся ва ўсе патрэбныя ўстановы, каб высветліць сутнасць зададзенага мною пытання і даць на яго грунтоўны адказ, хоць ліст быў не заказны і паслала я яго без паведамлення аб уручэнні.*

*А калі прачытала «Пытальнік» у «Звяздзе» за 5 жніўня і даведалася, што рашэнне Мінскага райвыканкама адменена і нам будуць даваць ацяпленне яшчэ гэтую зіму, радасці маёй і маіх суседзяў не было канца. Шчыра дзякуем вам, дарагія супрацоўнікі «Звязды», за тое, што вам лёс простага чалавека неабыякавы. Здароўя вам моцнага, творчых поспехаў. Хай дапамагае вам Бог і беражэ вас.*

**Нэля Іванаўна МАРЦУЛЬ, вёска Сёмкава Мінскага раёна».**

***Хаваць не будзем — атрымліваць такія лісты прыемна. Найперш яны — зваротная сувязь, сведчанне, што намаганні супрацоўнікаў газеты былі не марнымі, што яны далі плён, дапамаглі вырашыць праблему канкрэтнага заяўніка, проста падтрымалі чалавека ў складанай сітуацыі. Для нас гэта не менш важна, чым напісаць рэйтынгавы матэрыял. Таму пішыце, тэлефануйце надалей — што ў нашых сілах, паспрабуем зрабіць. Газету мы робім, як напісала Нэля Іванаўна, для простага чалавека — нашага чытача. Спадзяёмся, што яе праблема і праблема яе суседзяў сапраўды вырашылася.***

## Заробкі ўзраслі на 1,6 працэнта

**Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, рэальная зарплата ў ліпені ў параўнанні з чэрвенем узрасла на 1,6 %.**

Сярэдні ўзровень аплаты працы па краіне ў мінулым месяцы склаў 1,035 мільёна рублёў. Найбольшыя заробкі ў сталіцы — 1,35 млн руб. У Брэсцкай вобласці сярэдняя зарплата ў ліпені склала 922,7 тыс. руб., у Віцебскай — 940,9 тыс., Гомельскай — 971,2 тыс., Гродзенскай — 956,6 тыс., Мінскай — 988,8 тыс., Магілёўскай — 917,1 тыс. У большасці рэгіёнаў за студзень—ліпень гэтага года ў параўнанні з такім жа перыядам летась узровень аплаты працы павялічыўся ад 1,2 да 2,9 %. Выключэнне складае Магілёўшчына, дзе заробкі зменшыліся на 1,7 %. На прамысловых прадпрыемствах сярэдні заробак за ліпень склаў 1,09 мільёна рублёў, у будаўнічых арганізацыях — 1,42 млн, на транспарце — 1,22 млн, у сельскай гаспадарцы — 729,9 тыс. руб., гандлі і грамадскім харчаванні — 929,7 тыс., ахове здароўя — 816,3 тыс. (у тым ліку аплата працы ўрачоў — 1,42 млн, сярэдняга медыцынскага персаналу — 796,8 тыс. руб.), ва ўстановах адукацыі — 710,9 тыс. рублёў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

# ВІТАЙ, МАРЫЯ, ПОЎНАЯ ЛАСКІ!..

*У Браславе адбылася каранацыя абраза Маці Божай Валадаркі Азёраў*

**Каля 10 тыс. вернікаў сабралася ў суботу на пляц перад кафедральным касцёлам у Браславе на ўрачыстую падзею — каранацыю абраза Маці Божай Браслаўскай. На працягу амаль трох гадзін пілігрымы розных канфесій з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, ЗША, Германіі, Латвіі, Літвы, Італіі, Канады былі сведкамі гэтай гістарычнай падзеі.**

Урачыстае богаслужэнне праходзіла каля касцёла на спецыяльна пабудаваным алтары, які меў форму карабля, даўжынёй 32 метры. Карабель, на якім ўзвышаўся 22-метровы крыж, быў пабудаваны ўсяго за 40 дзён і па задумцы яго будаўнікоў з'яўляецца запрашэннем да падарожжа шляхамі Маці Божай Азёрнай.

Ускладанне каронаў здзейсніў архіепіскап Кёльнскі Ёахім Майснер, які ўзначальваў богаслужэнне.

— Я адчуваю сябе тут як дома, хоць у Беларусі і ўпершыню, — кажа архіепіскап Майснер. — Гэта не першы раз, калі мне даручаецца такая ганаровая місія каранацыі. Першы раз я каранаваў фігуру ў Польшчы. Увогуле, каранацыя — гэта вельмі важны знак. Бог карануе Марыю як чалавека, які з'яўляецца для нас блізкай асобай і якая можа нам дапамагчы. І калі мы карануем Марыю, кожны з нас асобу. Вобраз Маці — гэта і каханне, і прыгажосць, і міласэрнасць, і самае галоўнае — сям'я.

Каранацыя абраза праходзіла пад урачыстыя спевы зборнага хору Віцебскай епархіі, які налічваў 120 чалавек. Богаслужэнне адбывалася ў суправаджэнні аркестра з 20 музыкантаў.

«О, Марыя, наша Валадарка, дай ласку святасці для нашых Маці. А для нашых бацькоў — ласку трывання ў веры, — словы з Акта прысвячэння Марыі, зачытаныя **настаяцелям касцёла айцом Лешакам Вітвіцкім пасля абраду каранацыі,** шмат каго па-сапраўднаму расчулілі, многія плакалі ад шчасця. — Дай нам святых пастыраў, атуляй апекай тых, хто імкнецца ісці за Божым заклікам...»

— Братэрскае паяднанне ў любові — вось тое заданне, якое, на маю думку, пакінула нам Марыя, — дзеліцца ўражаннямі ад урачыстасці **манахіня-францішканка з Глыбокага сястра Габрыэля.** — Незалежна ад таго, кім ёсць кожны з нас: католікам, праваслаўным, грэка-католікам ці кімсьці яшчэ. Маці Божая аб'ядноўвае і прынамсі мне падалося, што гэтае спатканне адбылося пад знакам любові. Кожны адчуваў сябе, як брат і сястра.

— Кожны год я хаджу на гэтае свята — Маці Божай Браслаўскай, хоць сама я праваслаўная, — дадае 75-гадовая браслаўчанка Валянціна Іванаўна. — А сёлета яшчэ і такая ўрачыстасць! Вось іду назад, а ў самой аж слёзы цякуць — цяжка перадаць пачуцці. У душы так натхнёна, светла... Я, памятаю, нас, маленькіх, і да вайны бацькі вадзілі ў царкву, я і цяпер хаджу. Вунь яна, насупраць. А некалі ж нельга было... — Валянціна Іванаўна выцірае слёзы і працягвае: — Веру ў Бога, а ён мне заўсёды дапамагае. Нічога не прашу, толькі здароўя для сябе і для дзетак. І Бог заўсёды чуе мае малітвы...

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Прэм'ера рубрыкі «Купляй, але правярай!»

# БЕРАЖЫСЯ Б/У АЎТАМАБІЛЯ!

*«Спадары замежнікі! Вы там больш акуратна — на сваіх машынах... Нам яшчэ на іх ездзіць».*

*«Пакупка патрыманай машыны — латарэя. Прычым не часам, а заўсёды».*

**(з форуму аўтааматараў).**

**Усё пачалося з таго, што знаёмы матэрыяльна саспеў для пакупкі аўтамабіля. Перш чым паехаць на аўтарынак, вырашыў пакапацца ў інтэрнэце. І заўважыў, што кошты на аднолькавыя маркі машын з практычна ідэнтычнымі тэхнічнымі характарыстыкамі ў Беларусі (на сайце www.av.by) і ў Германіі (на сайце www.autoscout24.com) мала чым адрозніваюцца... Пра што гэта сведчыць?**

З такім пытаннем звярнулася да **навукоўца, кіроўцы са стажам, які пэўны час даследаваў гэту праблему (ён згадзіўся падзяліцца сваімі здагадкамі, пры ўмове пакуль што ананімнасці).**

— Можна меркаваць, што далёка не ўсе машыны, прыгнаныя ў Беларусь з-за мяжы (у адрозненне ад машын, выстаўленых на нямецкім сайце), адпавядаюць заяўленым перагоншчыкам параметрам. Адсюль і падазрона танны кошт. Бізнэсмен у першую чаргу думае пра сваю выгаду. Таму замест напрыклад, «Аўдзі-100» за 14 тысяч долараў ён набывае «такую ж», але за 7. Бярэ яе як аварыйную, з разбітай фарай, пагнутым крылом, не 2000, а 1999 года выпуску, з большым прабегам.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Зачапіла!

# У БЕЛАРУСКАГА БАКСЁРА СКРАЛІ ПОЯС ЧЭМПІЁНА СВЕТУ?

**У апошніх «чэмпіёнскіх» раўндах тытульнага двубоя наш Сяргей Гулякевіч збіў Умбэрта Гуцьераса, але суддзі аддалі перамогу гаспадару рынга — мексіканцу. «Звязда» высвятляла, як такое магло здарыцца?**

Доўгачаканы матч за чэмпіёнскі пояс WBC у малодшай лёгкай вазе, які адбыўся ў мексіканскім Лас-Кабасе, цяжка засмуціў беларускіх аматараў бокса. Паводзіны рэферы і рашэнне бакавых суддзяў абурылі беларускую каманду.

Наша тэлебачанне не транслявала гэты знакавы двубой, таму ў некалькіх словах распавяду пра тое, як развіваліся падзеі.

У першых раўндах накаўцёр Гуцьерас пачаў жорстка прэсінгаваць. Першыя раўнды былі за мексіканцам. Гулякевічу даставалася, але беларус пратрымаўся.

І ўжо ў сярэдзіне матча вопытны і вышкалены Гулякевіч здолеў выраўняць сітуацыю і паступова перахапіць ініцыятыву. Гуцьерас ужо не мог падабрацца да беларуса. Сяргей пачаў «расстрэльваць» мексіканца з дыстанцыі, ужо Гуцьерас, здавалася, вось-вось страціць прытомнасць. Калі справа падышла да галоўных «чэмпіёнскіх» раўндаў, перавага Гулякевіча стала відавочнай. І ў гэтай сітуацыі суддзі,

*Мексіканскія СМІ назвалі двубой Гулякевіча і Гуцьераса жахлівым.*

на думку каманды Гулякевіча, дапамаглі гаспадару рынга.

— З Сяргея знялі два ачкі. Першае — за тое, што ён быццам бы наўмысна рассек Гуцьераса галавой, другое — за тое, што выплюнуў капу, — перадае тэлефонную размову з менеджарам Гулякевіча бацька нашага баксёра Міхаіл Міхайлавіч. — Сын — вельмі карэктны спартсмен, ён не мог наўмысна пайсці на такія парушэнні. Калі б не знятыя ачкі, перамогу мусілі б аддаць яму, бо чэмпіёнскія раўнды былі за Сяргеем.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## На магілёўскага епіскапа напаў псіхічна хворы

Нядзельнай раніцай 23 жніўня на епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія напаў з нажом мужчына. Перад пачаткам службы, каля 9 гадзін уладыка ўвайшоў у кафедральны Сабор Трох Свяціцеляў у цэнтры Магілёва, звярнуўся да вернікаў з благаслаўленнем. У гэты момант мужчына нанёс епіскапу некалькі нажавых удараў: адзін у жывот, а другі ўдар прыйшоўся на руку, якой ён спрабаваў абараніцца.

З нажавымі раненнямі ўладыку тэрмінова даставілі ў гарадскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі і зрабілі аперацыю. Медыкі раніцай у панядзелак паведамілі, што ўладыка знаходзіцца ў рэанімацыі і праз суткі пасля аперацыі адчувае сябе нядрэнна. Прагноз на папраўку добры: жыццю епіскапа Сафронія цяпер нічога не пагражае. Мужчына, які напаў на святара, затрыманы. Яму 36 гадоў і, паводле паведамлення прэс-цэнтра Магілёўскага УУС, ён знаходзіцца на ўліку ў Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ПРЫПЯЧЭ ДА 30!

**У апошні тыдзень жніўня нас чакае добрае летняе надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

У першай палове тыдня надвор'е будзе вызначаць антыцыклон з цэнтрам непасрэдна над нашай краінай. Таму ападкаў не будзе, уначы і раніцай месцамі туман. Удзень 20—25, у сераду ўначы 6—12, па захадзе да 14, удзень — 21—27, на паўднёвым захадзе — да 30. У чацвер—пятніцу праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца невялікі атмасферны фронт. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы 10—17, удзень у чацвер 22—27, па поўдні да 30 цяпла, у пятніцу — 22—29. У суботу ападкаў не будзе, толькі на захадзе магчымыя невялікія дажджы. Уначы 12—18, удзень 22—27, па поўдні да 30.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## 634 — больш за 100!

Больш за ўсё доўгажыхароў — у Гродзенскай вобласці (152). На другім месцы — Мінская вобласць (105), на трэцім — Брэсцкая (97). На Віцебшчыне — 78, у Гомельскай вобласці — 77, у Мінску — 71, у Магілёўскай — 54. Жанчыны лідзіруюць амаль з 7-разовай «перавагай».

**БЕЛТА.**

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже обращенного в доход государства здания столовой, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 17 (двухэтажное кирпичное здание общей площадью 1764 кв. м, год постройки – 1962).**

Начальная цена – 4 724 028 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **25 сентября 2009 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **23 сентября 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

**БЕЛАРУСБАНК**

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31 АВГУСТА 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 29 августа), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 31 августа) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – до 29 августа 2009 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.**

УНП 100325912.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАЖАРЫ ПРЫВЯЛІ ДА МАСАВАЙ ЭВАКУАЦЫІ

**Жыхароў афінскіх прыгарадаў пачалі эвакуяваць з-за распаўсюджвання лясных пажараў.**



У пажарнікаў не атрымліваецца спыніць распаўсюджванне агню, выратавальнікам не хапае вады, ужо згарэлі дзясяткі дамоў і машын, ёсць пацярпелыя. Моцныя лясныя пажары пачаліся ва ўсходніх прыгарадах Афінаў у пятніцу, 21 жніўня. У тушэнні ўдзельнічаюць больш за 600 пажарнікаў, 12 самалётаў і сем верталётаў.

### ПАБОІШЧА НА РЫНКУ

**На рынку ў Адэсе адбылася масавая бойка, у якой удзельнічала да дзвюх тысяч чалавек.**

Канфлікт узнік паміж прыхільнікамі Дзмітрыя Назарава, які заве сябе новым дырэктарам рынка, і прадпрымальнікамі, якія абвінавачваюць Назарава ў рэйдарскім захопе. Пацярпела каля 10 чалавек.

### ІТАЛЬЯНЕЦ ВЫЙГРАЎ 148 МІЛЬЁНАЎ ЕЎРА

Жыхар італьянскай вёскі Баньёне ў суботу, 22 жніўня, выйграў у латарэю SuperEnalotto 147,8 мільёна еўра, што стала найбуйнейшым выйгрышам за ўсю гісторыю правядзення латарэй у Еўропе. Шанц адгадаць дакладны нумар складаў адзін да 622 мільёнаў.

ISSN 1990 - 763X

Выпрабавана на сабе

# ЯК Я РАБІЛА «ЧЫСТА, ЯРКА І ПРЫГОЖА»

*У Год роднай зямлі карэспандэнт «Звязды» паспрабавала сябе ў ролі зелянбудаўца*

**«Як у Мінску чыста, зелена і прыгожа!» — захапляюцца ўсе без выключэння замежнікі. Мы ляніва пагаджаемся — так і ёсць. Як быццам самі па сабе знікаюць сланечнікавае шалупінне, абрыўкі паперы і піўныя коркі з дарожак, аднаўляюцца і пакрываюцца свежай фарбай лаўкі ў парках, а нейкія нябачныя дамавікі вырошчваюць за ноч сорак ружовых кустоў. А мо і сапраўды мінчане прымаюць за дамавікоў — дакладней, «гарадавікоў» — людзей у зялёнай форме, якая амаль зліваецца з дагледжанымі газонамі? Тады тым больш не перашкодзіць экскурсія па другі бок гэтай дагледжанасці, кваліфікаванасці і чысціні — у будні ВКУП «Мінскзелянбуд».**

З пункту гледжання зелянбудаўцаў, сталіца — гэта 24 паркі і лесапаркі, 159 сквераў і 26 бульвараў, ды яшчэ безліч зялёных зонаў уздоўж вуліц, праспектаў і на прыдамавых тэрыторыях. І за ўсім трэба сачыць, вачэй не зводзячы. Асабліва калі раён работы — адзін з самых вялікіх у горадзе, як у Фрунзенскага падраздзялення «Зелянбуда».

— У нас вельмі многа пустэчаў, якія ідуць у бок МКАД. Паступова гэтыя тэрыторыі будуць забудоўвацца і добраўпарадкоўвацца, а пакуль што мы іх абслугоўваем, — расказвае **старшы майстар УП «Зелянбуд Фрунзенскага раёна» Галіна Леанідаўна КРАСОЎСКАЯ.** — Акрамя таго, у свой час гарвыканкам прымаў рашэнне, каб раённыя зелянбуды абслугоўвалі і прыдамавыя тэрыторыі. Не ўсе на гэта пайшлі, а вось мы пагадзіліся, і цяпер маем дадатковы вялікі кавалак працы: касьба, зграбанне травы і лісця, зімой — рассыпанне пяску. Работа ж круглы год ідзе, — тлумачыць, убачыўшы мае здзіўленыя вочы. — Зімой чысцім сцяжынкі ў парках, скверах, пешаходныя дарожкі каля дамоў. Усё гэта, заўважце, нашы жанчыны робяць уручную — амаль па тысячы метраў на чалавека «набягае». Усю зіму аўтадарожнікі сыплюць пясок з соллю, а як наступае вясна, наша задача — вычысціць ад гэтай сумесі ўсе прылеглыя да дарогі тэрыторыі. Пасля гэтых рэагентаў часта выпадае трава уздоўж дарог — мы наноў усё засяваем... У маі, як толькі міне пагроза моцных замаразкаў, пачынаецца ўжо і работа, якую, бадай, найбольш заўважаюць гараджане — пасадкі кветак, кустоў і г.д. Ёсць асноўныя кветнікі, якія робім пастаянна, штогод, а ёсць новыя кампазіцыі, якія прыдумляем кожны год розныя.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

*Граблі — зброя азеляняльніка!*

*«Медаль», «Хакеісты», «Мексіка» — гэтыя кампазіцыі можна ўбачыць у розных кутках сталіцы.*

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 827,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 043,18 |
| 1 латвійскі лат | 5 773,51 |
| 1 літоўскі літ | 1 170,36 |
| 1 чэшская крона | 158,67 |
| 1 польскі злоты | 982,89 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 89,59 |
| 1 украінская грыўня | 333,06 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,5544 |
| UAH | 37,1753 |
| 1000 BYR | 11,1107 |
| EUR | 45,1512 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены ва ўмацаванні беларуска-ўкраінскіх сувязяў

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанку з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці.**

Беларусь высока цэніць традыцыйна дружалюбныя адносіны з Украінай, заснаваныя на прынцыпах узаемнай павагі і добрасуседства, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Канструктыўны характар нашых сустрэч з'яўляецца дадатковым пацвярджэннем шчырай зацікаўленасці ва ўмацаванні існуючых сувязяў», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што ўсебаковае беларуска-ўкраінскае партнёрства будзе і ў далейшым актыўна і дынамічна развівацца, садзейнічаць падтрыманню высокага ўзроўню ўзаемадзеяння.

## Прэзідэнт бліжэйшыя некалькі дзён правядзе ў Сочы

На гэтым тыдні ў Сочы запланавана сустрэча прэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Дамоўленасць аб ёй была дасягнута ў ходзе сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева на нядаўнім нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц АДКБ у Кыргызстане. У ходзе маючых адбыцца перагавораў на вышэйшым узроўні плануецца абмеркаваць шэраг актуальных пытанняў беларуска-расійскага супрацоўніцтва. У сувязі з гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю, дзе правядзе бліжэйшыя некалькі дзён.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Настаўнік збіў сваю вучаніцу

Акно ДАІ

## За выхадныя падчас ДТЗ загінула 14 чалавек. Трое з іх — дзеці

Няшчаснае здарэнне са смяротным зыходам адбылося ў Лельчыцкім раёне ля вёскі Буда-Лельчыцкая. Вечарам жыхар Гомеля наехаў на «Сітраэне» на 8-гадовага хлопчыка. Школьнік, які не быў абазначаны святлоадбівальнымі элементамі, ехаў на веласіпедзе па краю праезнай часткі.

Другі наезд на дзіця здзейсніў 28-гадовы жыхар Баранавічаў, які ехаў на «Аўдзі» па тэрыторыі Ляхавіцкага раёна. 4-гадовы хлопчык (з Мінска) раптоўна выбег на дарогу з-за аўтамабіля, які стаяў на абочыне. Малы ў гэты ж дзень памёр ад атрыманых траўмаў у бальніцы.

Трэцяе дзіця, якое загінула на выхадных, з Лунінецкага раёна. Вучаніца 9 класа не справілася з кіраваннем веласіпеда і ўпала на «Аўдзі» свайго 39-гадовага настаўніка, які хацеў яе абагнаць.

**Начальнік службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» УДАІ МУС Яўген ЛАПЕЦ,** які расказаў «Звяздзе» аб гэтых здарэннях, паведаміў, што **з 25 па 10 верасня Дзяржаўтаінспекцыя МУС Рэспублікі Беларусь правядзе спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага—дзеці». У сувязі з гэтым ДАІ рэкамендуе кіроўцам рухацца з уключаным бліжнім святлом фараў.** На працягу 17 дзён на ўсёй тэрыторыі рэспублікі патруляванне аўтадарог будзе праходзіць на ўзмоцненым рэжыме.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Мільён за Ікара

Кіраўніцтва Гомельскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце выплаціць прэмію ў памеры 1 мільён рублёў асобе, чыя інфармацыя дапаможа знайсці самалёт і невядомага пілота, які час ад часу лятае над Рэчыцкім і іншымі найбліжэйшымі да яго раёнамі Гомельскай вобласці. Дакладна вядома, што 24 ліпеня лятальны апарат пралятаў пад мостам цераз Днепр у раёне вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна. Як паведаміў інспектар прафілактыкі Гомельскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце Аляксандр Валынскі, лёгкаматорны лятальны самаробны апарат бачылі супрацоўнікі ваенізаванай аховы, якія нясуць службу па ахове моста праз Днепр, і неаднаразова — многія жыхары гэтых мясцін. Аднамесны лятальны апарат не мае ніякіх апазнавальных знакаў, ён пафарбаваны ў цёмна-сіні колер і падобны на «Ан-2». Яго кабіна цэльная, а фюзеляж звараны з трубак. Сведкі сцвярджаюць, што шкло не дае магчымасці разгледзець пілота, хоць самалёт лятае вельмі нізка, часта — уздоўж ракі Днепр. На гэты момант супрацоўнікі міліцыі працягваюць пошук самалёта, на якім невядомы здзейсніў палёт над Гомельшчынай. Інфармацыю, якая дапаможа знайці пілота-самавучку і яго апарат, можна паведаміць па тэлефоне ў Гомелі: 8 0232+952117.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

***ВЫГЛЯД З ЛЕВАГА КРЫЛА***

*Меў цёмную афарбоўку*
*Цёмна-шэры*
*Цёмна-сіні*
*Характэрна — трэск рухавіка*




# БЕРАЖЫСЯ Б/У АЎТАМАБІЛЯ!

*(Заканчэнне. Пачатак 1-й стар.)*

А пасля па дарозе дадому даводзіць «ката» да таварнага віду: умешваецца ў камп'ютарную сістэму машыны і змяняе паказанні спідометра (змяншае прабег, дапусцім, з 600 да 200 тысяч кіламетраў), замазвае, заварвае, адным словам умела рэанімуе на нейкі час. І выстаўляе на продаж, як не бітую. Пры гэтым просіць за яе 13 тысяч долараў (!).

— Угаварыць «чайніка» набыць утрая даражэй падфарбаваную і падчышчаную машыну, якая да гэтага ўдзельнічала не ў адным дарожным пераплёце, бываламу прадаўцу не складана, — пацвердзіў была перагоншчык, які цяпер жыве ў Латвіі і працуе таксістам. — Галоўнае, упэўнена разрэкламаваць свой тавар. Прызнаюся, я сам аднойчы выгадна збыў старэнькі «рыдван» ярка-чырвонага колеру з гнілымі дзвярыма і парогамі. Мужчына нават і не падазраваў, якога «ката ў мяшку» прыдбаў. Калі шчыра, не хацеў бы я быць на яго месцы.

Паўтарыць вопыт мінчанкі Наталлі Карп, перакананна, таксама наўрад ці знойдзецца ахвотнік. Жанчына вырашыла набыць серабрысты «Форд» праз анлайн-аўкцыён. «Згодна з дагаворам, які я заключыла з пасрэднікам, роўна праз месяц аўтамабіль 2000 года выпуску павінен быў стаяць у маім гаражы. Абяцанага, як кажуць, тры гады чакаюць. Прадавец жа ўклаўся ў тры месяцы». Толькі Наташа села за руль доўгачаканага аўтамабіля, як адразу ж забылася на страчаныя нервы і час. Аказалася, дарэмна, усё толькі пачыналася. «Я паехала ў ДАІ ставіць аўтамабіль на ўлік. Менавіта там і высветлілася, што ён на год старэйшы. А значыць і на парадак таннейшы». Наталля вырашыла змагацца за свае правы. Тут жа звязалася з прадаўцом і папрасіла яго вярнуць частку грошай. Прадавец адмовіўся ісці на кантакт. Тады ахвяра падала іск у суд Заводскага раёна Мінска. Махляр, вядома ж, не чакаў такога павароту падзей. Каб не псаваць сваю рэпутацыю, прапанаваў заключыць міравое пагадненне, і ў рэшце рэшт вярнуў частку грошай.

### Парада ад пацярпелай:

— Мяне выратавала толькі тое, што дагавор быў складзены правільна. У іншым выпадку нічога не атрымалася б даказаць. Парада ўсім грамадзянам адна: знаходзіце грошы на машыну, знайдзіце іх і на кансультацыю юрыста. Лепш заплаціць адразу, чым пасля страчваць значна большыя сумы грошай і нервы, што таксама немалаважна.

— Калі чалавек не мае спецыяльнай юрыдычнай адукацыі, то яго лёгка абвесці вакол пальца, — пацвярджае думку Наталлі **юрыст Мінскага таварыства спажыўцоў Андрэй ЕРМАКОВІЧ.** — Прычына ў тым, што арганізацыі, якія неаднаразова мелі справу з іскамі спажыўцоў, ужо навучыліся прадугледжваць у дагаворах такія палажэнні, якія вызваляюць іх ад адказнасці. Напрыклад, перагоншчык абяцае вам даставіць аўтамабіль праз 20 дзён. Але толькі на словах. У дагаворы ж, які большасць кліентаў замест таго, каб уважліва прачытаць, проста прабягаюць вачыма, значыцца тэрмін пастаўкі да трох кварталаў. Лічыце, вы проста выдалі махляру беспрацэнтны крэдыт на тры кварталы. Чытайце дагавор, а не слухайце тое, што вам гавораць. Гэта розныя рэчы. Бо праз месяц прадавец забудзе на свае абяцанні і будзе тыцкаць пальцам у дагавор.

Андрэй Ермаковіч расказаў, што ў яго практыцы былі выпадкі, калі людзі даведваліся аб падмане толькі пасля таго, як трапілі ў аварыю. Экспертыза паказвала, што прабег іх «новага» аўтамабіля значна большы за акрэслены ў дагаворы. «У гэтым выпадку раю патрабаваць ад прадаўца розніцу паміж завышаным і сапраўдным коштам аўтамабіля. Праўда, спагнаць грошы можна зноў-такі толькі ў тым выпадку, калі ў вас на руках маюцца правільна аформленыя дакументы».

> «Чытайце дагавор, а не слухайце тое, што вам гавораць. Гэта розныя рэчы. Бо праз месяц прадавец забудзе на свае абяцанні і будзе тыцкаць пальцам у дагавор.

Вадзіма, аўтаперагоншчыка з дзесяцігадовым стажам, адрэкамендавалі «Звяздзе» як знаўцу сваёй справы. Праўда, бізнэсмен сам сябе не імкнуўся ідэалізаваць.

— Здараецца, што праз дзень-два кліенты тэлефануюць і прад'яўляюць прэтэнзіі, — кажа ён. — Мы ж не богі, таксама можам нешта недагледзець. Але да суда «цьфу-цьфу» справу не даводзім, стараемся разам знайсці кампраміс. Што ж датычыцца нячыстых на руку перагоншчыкаў, я іх не разумею. Вы ж ведаеце, што ў гандлі дзейнічае прынцып ланцужковай рэакцыі: аднаму прыгнаў, ён, задаволены, рэкамендуе цябе сваім знаёмым. Махляры ж, разводзячы на грошы аднаго кліента, адразу ж пазбаўляюцца некалькіх патэнцыяльных.

***А зараз увага! Вадзім згадзіўся спецыяльна для «Звязды» даць некалькі каштоўных парад людзям, якія збіраюцца набыць аўто, і пры гэтым раскрыў некаторыя хітрыкі аўтаперагоншчыкаў.***

### Прыйшоў, убачыў, перамог

1) — Не рэкамендую набываць аўтамабіль праз інтэрнэт. Дзе гарантыя, што вам прыгоняць такую ж «ляльку», як на малюнку? Мы з напарнікам адноечы самі трапілі на падобную вудачку. Знаёмы патэлефанаваў з Бельгіі і прапанаваў два вельмі танныя аўтамабілі, якія, паводле яго слоў, патрабавалі лёгкага касметычнага рамонту. Згадзіліся, не доўга думаючы. Праўда, праз пару дзён сто разоў пашкадавалі аб сваім рашэнні. Ведаеце, такіх машын да гэтага мы і не бачылі. Было адчуванне, што ў «Форд» закінулі гранату і зачынілі дзверы, а «Сітраен» у гэты час стаяў непадалёк. З таго часу мы ніколі не бяром машыны, не бачачы яе. Прабачце, але ж гэта не каструля, якая каштуе сто тысяч. Таму раю набываць машыну на рынку, дзе зможаце не толькі ўбачыць яе сваімі вачыма звонку і знутры, але і праехаць на ёй.

2) — Выбіраць машыну лепш за ўсё са знаёмым, які разбіраецца ў аўтатэхніцы. Ідэальны варыянт, калі гэты спецыяліст непасрэдна займаецца рамонтам аўтамабіля менавіта той маркі, пра якую вы марыце.

3) — Для падстрахоўкі можна загнаць аўтамабіль на станцыю тэхнічнага абслугоўвання. Але і тут трэба быць асцярожнымі. Прадавец можа, на першы погляд, зусім ненавязліва прапанаваць зрабіць

> «Угаварыць «чайніка» набыць утрая даражэй падфарбаваную і падчышчаную машыну, якая да гэтага ўдзельнічала не ў адным дарожным пераплёце, бываламу прадаўцу не складана.

дыягностыку дзе-небудзь паблізу. Хутчэй за ўсё, вы маеце справу з махляром.

### Язык да Кіева давядзе

1) — Была ў практыцы і такая сітуацыя: прадалі машыну чалавеку савецкай загартоўкі. Зніжку яму зрабілі. Недзе праз два месяцы ён патэлефанаваў: «Слухай, трэба, каб вы машыну забралі, бо мне абслугоўваць яе дорага». А чаму вы не падумалі пра гэта перад тым, як набыць машыну? — спытаўся я. Мужчына, падалося, мяне нават не слухаў, пачаў пагражаць судом. Я паклаў трубку, а кліент, на шчасце, больш не тэлефанаваў.

Паважаныя, перад тым, як набываць дарагую рэч, не палянуйцеся і даведайцеся ў інтэрнэце станоўчыя і адмоўныя бакі машыны, пацікаўцеся, наколькі даступна абслугоўванне гэтай маркі машыны ў нашай краіне. Парайцеся па магчымасці не з чалавекам, які змяніў пару-тройку «БМВ» (мы ўсе розныя, кожнаму падабаецца свая мадэль), а з людзьмі незалежнымі, са слесарамі, прадаўцамі запчастак. Кажуць, язык да Кіева давядзе, так і тут — усё залежыць толькі ад вас.

2) — А як вы ставіцеся да людзей, якія таргуюцца? — цікаўлюся.

— Станоўча. Гэта ж рынак. Калі атрымліваецца, абавязкова скідваем кошт. Але і тут важна не перагнуць палку. Былі пакупнікі, якія хацелі набыць аўтамабіль са зніжкай у дзве тысячы долараў. Маўляў, у нейкай газеце пісалі, што на рынку гэта магчыма.

— А няўжо вы ніколі не падманвалі кліента?

— Большасць перакупшчыкаў не падманвае, а проста спецыяльна недагаворвае нейкую інфармацыю. Ад пакупніка залежыць, трапіць ён на гэту вудачку ці не. Раю на рынку адчуваць сябе гаспадаром сітуацыі, бо, як вядома, кіраваць балам павінен той, у каго грошы, не дазваляйце сабой маніпуляваць.

І, нарэшце, калі ж вы ўсё ж такі вырашылі набыць машыну на заказ, то няхай гэта зробіць праверaны чалавек. Асабіста я не даверыў бы прыгнаць машыну чалавеку, якога бачу ўпершыню.

***P.S. Перагоншчыкі перад тым, як прадаць аўтамабіль, тэарэтычна павінны правесці яго перадпрадажную падрыхтоўку. Але на практыцы машына рыхтуецца абы-як і абы-дзе. Як правіла, аўтаперагоншчыкі, каб эканоміць грошы і час, заганяюць аўтамабіль у гараж, дзе «націраюць яго да бляску». Пра ўнутраны ж стан думаюць у апошнюю чаргу. Сумняваюся, што нехта фірмовыя, але старыя запчасткі мяняе на аналагічныя новыя. Хутчэй за ўсё, замест іх набываюць танныя дэталі невядомага паходжання. Колькі яны выхадзяць — невядома. Ды і якая розніца, галоўнае збыць, а далей хай хоць трава не расце. Такія падыходы пужаюць. Магчыма, настаў час увесці сертыфікаты перадпрадажнай падрыхтоўкі аўтамабіля, якія маглі б выдаваць новыя станцыі кантрольнай дыягностыкі. Трэба нарэшце размежаваць паняцці: я прадаю аўтамабіль, і я прадаю сукупнасць вузлоў і дэталяў, якая можа разваліцца ў любы момант. Колькі можна нажывацца на наіўнасці і давер'і спажыўца! Зброя, гэтаксама як і аўтамабіль — крыніца павышанай бяспекі. Але яе, у адрозненне ад «жалезнага каня», проста так не вынесеш на рынак...***

**Магчыма, вы, паважаныя чытачы, таксама, як Наталля Карп, сталі ахвярай нейкага прадаўца (будаўнічых матэрыялаў, прадуктаў харчавання, адзення, абутку...). Пішыце, тэлефануйце (287 17 40). Давайце з уласнай практыкі папярэджваць аб небяспецы іншых патэнцыяльных ахвяраў. Давайце разам выводзіць махляроў на чыстую ваду.**

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

### ЯК ТРАПІЦЬ У ІНТЭРНАТ?

Для аператыўнага рэагавання па пытаннях забеспячэння студэнтаў месцамі ў інтэрнатах у БДУ арганізуецца работа «гарачай» тэлефоннай лініі 209 56 49. Тэлефанаваць на «гарачую» лінію можна з 24 па 29 жніўня і з 31 жніўня па 4 верасня з 9.00 да 18.00. Створаны электронны банк звестак пра кватэры і пакоі на сайце БДУ www.bsu.by у раздзеле «Студэнцкае жыццё».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ЗАБАРАНЕНЫ ПРОДАЖ ЛЯКАРСТВАЎ І БІЯАКТЫЎНЫХ ДАБАВАК ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Урад Беларусі пастановай № 1091 ад 19 жніўня 2009 года забараніў рэалізацыю па ўзорах па-за гандлёвым аб'ектам шэрагу тавараў, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў.**

У прыватнасці, не дапускаецца продаж па ўзорах па-за гандлёвым аб'ектам вырабаў з каштоўных металаў і каштоўных камянёў, піратэхнічных вырабаў, лекавых сродкаў, біялагічна актыўных дабавак да ежы, якія падлягаюць рэалізацыі толькі праз аптэкі, а таксама ветэрынарных сродкаў, зброі і патронаў да яе. Рознічны гандаль па ўзорах па-за гандлёвым аб'ектам скорапсавальнымі харчовымі таварамі і кулінарнай прадукцыяй дапускаецца пры наяўнасці ў прадаўца гандлёвага аб'екта, у якім прадаюцца такія тавары. Пастанова Савета Міністраў № 1091 уступае ў сілу праз 10 дзён пасля афіцыйнага апублікавання.

## Спорт-тайм

### Гурэнка пачаў з перамогі

Удалым стаўся дэбют у ролі галоўнага трэнера мінскага «Дынама» Сяргея Гурэнкі. У канцы гасцявога матча з брэсткім «Дынама» яго футбалісты ўсё ж забілі адзіны і пераможны гол. Наваполацкі «Нафтан», атрымаўшы перамогу над «Тарпеда» (Жодзіна) таксама ў гасцях і з лікам 1:0, выйшаў на другое месца ў турнірнай табліцы.

Вынікі астатніх матчаў 16 тура: «Днепр» (Магілёў) — «Віцебск» — 3:2, «Гомель» — «Граніт» (Мікашэвічы) — 1:1, «Мінск» — «Нёман» (Гродна) — 0:0, МТЗ-РІПА (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск) — 1:2. Матч БАТЭ (Барысаў) — «Смаргонь» перанесены.

Між тым, асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» распаўсюдзіла заяву, што «ў цяперашні час Сяргей Гурэнка не валодае ліцэнзіяй УЕФА, не праходзіць адукацыйны курс, які дазваляе яму атрымаць патрабаваную ліцэнзію, і, адпаведна, не можа займаць пасаду галоўнага трэнера».

У Італіі стартаваў чарговы чэмпіянат, і ў ім вызначыўся нападаючы зборнай Беларусі Віталь Кутузаў. Ён забіў гол міланскаму «Інтэру» і прынёс свайму клубу «Бары» гасцявую нічыю — 1:1.

### Гімнасткі парадавалі дома

Беларуска Меліта Станюта заваявала сярэбраны і тры бронзавыя медалі ў індывідуальных практыкаваннях на этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы, які прайшоў у Мінску.

Сярэбраную ўзнагароду Станюта атрымала ў практыкаванні са скакалкай, бронзавыя — у практыкаваннях з абручом, мячом і стужкай. Усе залатыя медалі ў індывідуальных практыкаваннях заваявала расіянка Яўгенія Канаева. Таксама на спаборніцтвах былі разгуляныя медалі ў групавых практыкаваннях. Беларускія грацыі сталі сярэбранымі прызёркамі ў практыкаваннях са стужкамі і скакалкамі і бронзавымі — з абручамі.

### У Берліне, як у Севільі

Беларускія атлеты засталіся без медалёў на 12 чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, які завяршыўся ў Берліне. Папярэдні раз наша каманда вярталася без узнагарод са спаборніцтваў такога ўзроўню ў 1999 годзе з іспанскай Севільі. Бліжэйшай за ўсіх да пастамента была штурхальніца ядра Наталля Міхневіч, якая заняла 4 месца. Беларусь паслала ў Берлін 26 спартсменаў — па 13 мужчын і жанчын.

Дзясятку лепшых камандаў у неафіцыйным медальным заліку склалі зборныя ЗША — 10 залатых узнагарод, 6 сярэбраных і 6 бронзавых, Ямайка — 7, 4, 2; Кенія — 4, 5, 2, Расія — 4, 3, 6; Польшча — 2, 4, 2; Германія — 2, 3, 4; Эфіопія — 2, 2, 4; Вялікабрытанія — 2, 2, 2; ПАР — 2, 1, 0; Аўстралія — 2, 0, 2.

### Не ў эліце

Футбалісты зборнай Беларусі не змаглі прабіцца ў элітны дывізіён Еўралігі па пляжным футболе. У Партугаліі ў кваліфікацыйным раўндзе суперфіналу наша каманда абыграла Турцыю (па пенальці), але саступіла Румыніі — 2:3. У матчы за трэцяе месца ў дывізіёне В нашы футбалісты перамаглі азербайджанцаў — 3:2. Адзіная пуцёўка ў кампанію найлепшых зборных кантынента дасталася румынам. Пераможцамі розыгрышу Еўралігі сталі расіяне, якія нечакана перамаглі ў фінале партугальцаў — 4:3.

# У БЕЛАРУСКАГА БАКСЁРА СКРАЛІ ПОЯС ЧЭМПІЁНА СВЕТУ?

*(Заканчэнне. Пачатак 1-й стар.)*

— Сярога малайчына, але мексіканцы ні за што не аддалі б яму перамогу, — дадае баксёр Юрась Раманаў, сябар Сяргея Гулякевіча. — Быў адзіны шанец — накаўтаваць мексіканца. Калі змагаешся за мяжой, то разлічваць на справядлівасць не даводзіцца.

Па словах бацькі баксёра Міхаіла Міхайлавіча, Сяргею таксама дасталося. Баксёры ўчынілі сапраўдную сечу.

Несправядлівае рашэнне суддзяў бацька патлумачыў карумпаванасцю ў свеце прафесійнага бокса і безабароннасцю беларускіх спартсменаў перад акуламі сусветнага прамоўтарскага бізнэсу.

— Мексіка — адна з наймацнейшых баксёрскіх краін, перад гэтым двубоем там была праведзена фантастычная рэкламная кампанія, — разважае Міхаіл Міхайлавіч. — Мексіканцам давялося зганьбіцца, давялося схлусіць на вачах у экспертаў сусветнага бокса, аддаўшы перамогу Гуцьерасу. І тое, што непераможаны чэмпіён Еўропы з Беларусі Гулякевіч патрапіў у Мексіку, патрапаў ім нервы — гэта ўжо вялікае дасягненне.

На развітанне Міхаіл Міхайлавіч выказаў думку, што гэта несправядлівая параза насамрэч прынясе непараўнальную карысць беларускаму боксу і Сяргею Гулякевічу.

— Сяргей дайшоў да тытульнага паядынку без прамоўтара, гэта неверагодная рэдкасць для сусветнага бокса, — падкрэслівае бацька баксёра. — Сяргей Гулякевіч — гэта Ламаносаў беларускага бокса. І ён здолеў пра сябе заявіць на ўвесь свет. Паехаць сёння ў Мексіку — гэта тое ж самае, што пайсці на сустрэчу з Чынгісханам падчас мангола-татарскага іга. Але Сяргей не пабаяўся, баксёрскі свет апладзіраваў яму. Перакананы, што чарговы тытульны двубой з удзелам Сяргея адбудзецца ў хуткім часе. Мы зробім высновы з гэтага паядынку, трошкі адпачнём — і наперад.

Падобныя сітуацыі ў кар'еры Гулякевіча ўжо здараліся. Некалькі гадоў таму, калі беларус пачынаў прафесійную кар'еру, яму зладзілі паядынак з зоркай сусветнага бокса брытанцам Алексам Артурам. Невядомы беларус паказаў зубы і «пахіснуў» Артура. Брытанцу давялося ўжыць забаронены прыём — ён кінуўся наперад ілбом і рассёк галаву Гулякевіча, матч спынілі. Праз некалькі месяцаў Алекс Артур стаў чэмпіёнам свету сярод прафесіяналаў і прызнаўся, што Гулякевіч — самы цяжкі супернік у яго жыцці.

Па інфармацыі «Звязды», пасля паядынку з Гуцьерасам на Гулякевіча звярнулі ўвагу некалькі сусветнавядомых прамоўтараў. Калі нашага баксёра будзе нехта з іх апякаць, Сяргей наўрад ці патрапіць у такую ж недарэчную сітуацыю, як гэта здарылася ў Мексіцы.

А беларускім спартовым заўзятарам застаецца з разуменнем паставіцца да недарэчнага судзейскага рашэння ў Мексіцы і падтрымаць Сяргея Гулякевіча ў няпросты час.

Баксёр і яго трэнер Пятро Букштановіч вяртаюцца ў Мінск 26 жніўня.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

# ВІТАЙ, МАРЫЯ, ПОЎНАЯ ЛАСКІ!..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Традыцыя каранавання абразоў паходзіць з XVII стагоддзя. Карона (ад лац. corona — вянец, вянок) з даўніх часоў з'яўлялася сімвалам улады, знакам павагі і моцы. Лічылася, што такім чынам ушаноўваецца гонар Маці Божай. Першая ўрачыстая каранацыя абраза Маці Божай адбылася 27 жніўня 1631 г., падчас пантыфікату Урбана VIII, у харальнай капліцы ў базыліцы святога Пятра.

І сёння, згодна з вучэннем Каталіцкай Царквы, кожны абраз можа каранавацца толькі адзін раз, але для гэтага павінны быць падставы: абраз павінен не толькі здаўна ўшаноўвацца, але і лічыцца цудадзейным. Гэтыя ўмовы павінен пацвердзіць мясцовы епіскап, які падае прашэнне аб каранацыі.

Падчас існавання Рэчы Паспалітай у яе межах было каранавана 27 абразоў, з якіх 5 — у ВКЛ і 6 — у Польшчы. На тэрыторыі сучаснай Беларусі было каранавана два абразы: Маці Божай Жыровіцкай (1730) і Маці Божай Бялыніцкай (1761).

У суверэннай Беларусі абрад каранацыі марыйных абразоў быў распачаты толькі ў 1996 г. Тады папскія кароны былі ўскладзены на абраз Маці Божай Берасцейскай. Праз год — на абраз Маці Божай Лагішынскай (1997 г.). У 1998 г. каранавалі абраз Маці Божай Будслаўскай (1998 г.), у 2005 г. — абраз Маці Божай Кангрэгацкай у Гродне, у 2007-м — абраз Маці Божай Гудагайскай. У пачатку ліпеня гэтага года быў каранаваны абраз Маці Божай Тракельскай.

Паводле гістарычных звестак, абраз Маці Божай Валадаркі Азёраў калісьці знаходзіўся ў грэка-каталіцкім манастыры, які ў 1832 годзе згарэў ад удару маланкі. Ікона ж цудам захавалася і з таго часу знаходзіцца ў браслаўскім касцёле. Апошнія два месяцы абраз знаходзіўся на рэстаўрацыі ў Мінску. Кароны на абраз былі зроблены ў Кракаве паводле праекта мастака кс. Антонія Паланяка. 18 лютага 2009 г. на плошчы Святога Пятра іх асвяціў Папа Бенедыкт XVI.

Абраз Маці Божай Браслаўскай стаў сёмым па ліку каранаваным абразам у Беларусі, а таксама першым каранаваным у Віцебскай вобласці. Увогуле, сёлетні год вельмі знакавы для Віцебшчыны: самая маладая ў Каталіцкай Царкве Віцебская епархія ў кастрычніку адзначыць 10 гадоў з моманту заснавання. Адметна і тое, што яе першы епіскап — ксёндз Уладзіслаў Блін — у гэтым годзе таксама адзначае 10-ю гадавіну пасвячэння епіскапскай сакры...

— Марыя нездарма ўпрыгожана каронай, якую атрымала ад свайго сына, — сказаў на закančэнне архіепіскап Кёльнскі Ёахім Майснер. — Тое, што яна была ўзята на неба з усёю сваёю чалавечаю істотаю, для нас становіцца выклікам, які адначасова з'яўляецца надзеяй. Бог хоча асвяціць нас — усё нашае чалавечае існаванне, і прыняць на неба. Праз гэта Бог надае нашаму жыццю сапраўдны сэнс...

Падчас набажэнства, калі ў ясным небе зусім не было аблокаў, каля сонца раптам з'явілася вясёлка.

— Яна як бы плыла, — расказвае Рэгіна Корань з Мінска. — Людзі спрабавалі яе сфатаграфаваць, але не атрымоўвалася: камеры не бралі. А яна ўсё плыла і плыла. А потым знікла. Гэта сапраўдны цуд!..

— Маё сэрца, мая душа перапоўненыя светам і цяплом, — прызнаецца **Алімпіяда Альбінаўна КРУПЕНЬ,** якая прыехала ў Браслаў з Полацка. — Самае цяжкае ў жыцці верніка чалавека — гэта ўмацаванне яго веры. Сённяшняя каранацыя і гэта вясёлка ў небе — сапраўды дапамагаюць зрабіць веру мацнейшай. Гэта ў некаторай ступені аб'яднанне ўсіх хрысціянаў у Беларусі. І я веру, што сённяшняя падзея стане мастом паміж хрысціянскімі цэрквамі ў Беларусі.

**Ілья ЛАПАТО.**

*г. Браслаў.*

## Абзац

**◢ Учора ў Мінску на вуліцы Карла Маркса ў 16.20 загарэўся мікрааўтобус. Надзвычайнае здарэнне адбылося насупраць філалагічнага факультэта БДУ. Салон аўтамабіля цалкам выгараў, пацярпелых няма. Папярэдняя прычына ўзгарання, па звестках супрацоўнікаў МНС, — неасцярожнае абыходжанне з агнём. У маторны адсек аўтамабіля агонь трапіць не паспеў.**

◢ У Уздзенскім раёне муж з рэўнасці задушыў жонку і павесіўся. Трагедыя адбылася ў вёсцы Любяча. З заявай пра смерць бацькоў у міліцыю звярнуўся 13-гадовы падлетак. Ён расказаў, што бацька ў парыве рэўнасці задушыў маці вяроўкай, пасля чаго павесіўся на тэрыторыі дома, што будуецца. Праводзіцца праверка.

**◢ У даведачную службу 411 пазваніў невядомы падлетак і сказаў, што зробіць выбух у офісе гэтага прадпрыемства. Узнятым па трывозе супрацоўнікам праваахоўных органаў удалося хутка вылічыць і затрымаць жартаўніка. Ім быў 12-гадовы вучань 6-га класа Зарэчанскай СШ, жыхар г.п. Зарэчча Рэчыцкага раёна. Па факце праводзіцца праверка.**

◢ Колькасць жыхароў Афрыкі дасягнула мільярда чалавек і павялічваецца на 24 мільёны ў год, гаворыцца ў дакладзе амерыканскага ўрадавага агенцтва USAID, што займаецца эканамічнай і гуманітарнай дапамогай бедным краінам. Калі такія тэмпы захаваюцца, да 2050 года насельніцтва чорнага кантынента падвоіцца. Пры некаторым зніжэнні нараджальнасці на поўначы краіны, напрыклад, у Егіпце і Тунісе, на поўдзень ад Сахары яна застаецца на ўзроўні 5,3 дзіцяці на жанчыну. Самая высокая нараджальнасць у Нігеры, жыхаркі якога пускаюць у свет у сярэднім па сем дзяцей.

## Поўны абзац

**◢ Незвычайная прапанова гатэля ў Венецыі правесці ў ім тыдзень усяго за 1 цэнт выклікала ажыятаж сярод кліентаў. Адміністрацыя, заўважыўшы памылку, выправіла яе, аднак ужо зробленыя замовы не стала адмяняць. Памылка была дапушчаная ў сістэме браніравання нумароў 4-зоркавага гатэля Crowne Plaza. Кошт нумара тут складае звычайна 150 еўра ($214) за ноч. У выніку памылкі ўсяго за некалькі гадзін было замоўлена 1.400 нумароў, што прынясе гатэлю каля 90 тыс. еўра стратаў.**

◢ Згодна з рашэннем суда, 28-гадовая жыхарка амерыканскага горада Фларэнса атрымае $2 млн кампенсацыі з-за памылкі стаматолага. Яна мела намер выдаліць толькі тры зубы, калі выправілася да дантыста ў 2006 годзе. Аднак замест гэтага ўрач не «паскупіўся» і выдаліў ёй 16 зубоў у верхняй сківіцы. Жанчына запатрабавала не менш як $82 тыс. кампенсацыі. Гэтыя грошы спатрэбіліся на ўзнаўленне разбуранага жавальнага апарату. Усвядоміўшы, што ўрач зрабіў памылку, супрацоўнікі клінікі паспрабавалі памяняць запісы ў дакументах, аднак жанчына падала ў суд і змагла адстаяць сваё права на кампенсацыю ўрону. Суд пастанавіў, што пацярпелая пацыентка павінна атрымаць ад клінікі $2 млн.

**◢ У аэрапорце «Піянерны» Аляксандраўскага раёна Томскай вобласці самалёт Ан-24 пры заходзе на пасадку быў вымушаны пайсці на другі круг з-за знаходжання на ўзлётна-пасадачнай паласе хатняй жывёліны. Паводле папярэдніх звестак, перашкодай самалёту стала карова, што пасвілася там. На борце Ан-24 было 44 пасажыры і 450 кг грузу. Праз пэўны час самалёт удала прызямліўся, ніхто не пацярпеў.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

*Открытое акционерное общество*

**«СТАРАЯ ФАБРИКА»,**

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19

**СООБЩАЕТ, ЧТО 29 СЕНТЯБРЯ 2009 ГОДА В 10.00 ПО АДРЕСУ: г. МИНСК, ул. ОКТЯБРЬСКАЯ, 19 (ПРИЕМНАЯ), 2 ЭТАЖ, СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об уменьшении размера Уставного фонда ОАО «Старая фабрика».
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Старая фабрика».

Дата составления списка для регистрации участников собрания **18 сентября 2009 года.** Регистрация участников собрания будет проводиться **29 сентября 2009 г. с 9.30 до 9.50** по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19 (приемная).

Участникам собрания необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

УНП 100640022

**ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА (ПРОДАВЕЦ)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**Лот 1** — земельный участок № 1 в д. Родевичи площадью 0,2282 га, кадастровый номер 623280810601000028, начальная цена 504 260 белорусских рублей.

**Лот 2** — земельный участок № 2 в д. Родевичи площадью 0,2282 га, кадастровый номер 623280810601000029, начальная цена 504 260 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619021104 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП

# З БОЛЕМ У СЭРЦЫ — ДА ТЭРАПЕЎТА

**Карысныя падказкі дае загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Ірына ЯКІМОВІЧ**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**(Працяг. Пачатак у нумары за 22 жніўня.)**

***☎ — Стоўбцы, Міхаіл Дзмітрыевіч, 74 гады. Інвалід 2 групы. Поліартрыт, рэўматоідны артрыт. Прапісалі прэднізалон, метатрэксат, для сэрца — аспаркам, мілдранат, дыятэазем. Аднак лягчэй не становіцца. Вось ужо паўгода пранізлівыя болі ў сэрцы не знікаюць. Ціск — 140/80. Скажыце, што можна дабавіць да лячэння сэрца?***

— Трэба вызначыць, чым абумоўленыя болі. Магчыма, гэта не толькі прыступы стэнакардыі. Рэўматоідны артрыт паражае яшчэ касцёва-сустаўную сістэму, таму варта даабследаваць грудны аддзел пазваночніка. Магчыма, на гэтым узроўні заціскаюцца нервовыя карашкі, адсюль і боль. Неабходна правесці асобную дыягностыку па сэрцы і пазваночніку. Магчыма, вам патрэбна лячэнне па ішэмічнай хваробе сэрца, а магчыма, трэба дадаткова прызначыць прэпараты ад артрыту. А можа быць, боль з прычыны стэнакардыі накладваецца на боль у пазваночніку. Звярніцеся спачатку да рэўматолага і зрабіце здымкі пазваночніка.

***☎ — Мінск, Валянціна Пятроўна. Мужу сястры — 32 гады. Пакутуе ад галаўных боляў на працягу дня. Часам яны трымаюцца па 2-3 дні. Ноччу — з 12.00 да 2.00 грукае сэрца. Рабілі магнітна-рэзанансную тамаграфію галаўнога мозгу, сутачную кардыяграму — усё ў норме. Спрабаваў хадзіць на масаж галавы, стала горш. Піў канкор, але не дапамагае. Былі ў неўрапатолага, кардыёлага. Скажыце, дзе абследавацца, каб даведацца, што робіць з сэрцабіццём і галаўным болем?***

— Тут падаецца незразумелым, чаму холтар-манітарыраванне не паказала ніякіх адхіленняў... Характар галаўных боляў мае сасудзістае паходжанне, падобнае да мігрэні. Хутчэй за ўсё, гэта сіндром вегетасасудзістай дысфункцыі, так званая ранняя вегетасасудзістая дыстанія з мігрэнепадобнымі параксізмамі. Неабходна ў любым выпадку даабследавацца ў неўролага. Акрамя таго, наладзіць рэжым і адпачынак, абмежаваць работу з працяглым напружаннем зрокавага аналізатара, паколькі гэта спрыяе захворванню. Выражаныя галаўныя болі могуць быць пры выражаным парушэнні кровазвароту. Каб гэта высветліць, зрабіце здымак шыйнага аддзела пазваночніка. Што да сэрцабіцця, то гэта можа быць праявай той жа вегетасасудзістай дыстаніі, здольнай павялічваць частату сардэчных скарачэнняў. Добра было б пракантраляваць артэрыяльны ціск у момант прыступу. Калі ціск павышаецца, значыць, можна гаварыць пра саматаформную вегетатыўную дысфункцыю з перавагамі з боку сімпатычнай нервовай сістэмы. Тады прызначаюцца бэтаадрэнаблакатары, той жа канкор. Паколькі самаадчуванне пагаршалася на фоне прыёму канкору, магчыма, трэба больш дакладна падабраць яго дозу. Эфектыўнасць прэпарата вызначаецца па пульсе. На фоне прыёму канкору пульс павінен быць на ўзроўні да 60-ці. Плюс прэпараты седатыўныя — заспакаяльныя. Яны могуць быць і раслінная паходжання — персэн, трыкардын. Канчатковыя высновы зробіць неўролаг.

***☎ — Віцебск, Віктар Антонавіч. 58 гадоў. Пасля моцнага стрэсу пачаліся скачкі ціску і падзенне пульсу да 31 удару. Пяць гадоў прымаю эналапрыл. Ціск верхні бывае 180, 170. Чаму так моцна падае пульс? Дзе праіце абследавацца?***

— Неабходна абавязкова правесці холтар-манітарыраванне — для выключэння слабасці сінусавага вузла. Галоўны «кантралёр» рытму — сінусавы вузел, які задае колькасць сардэчных скарачэнняў у хвіліну. А ў сэнсе артэрыяльнай гіпертэнзіі вам неабходна падабраць камбінаваную тэрапію. Аднаго эналапрылу недастаткова, патрабуецца спалучэнне прэпаратаў. Звярніцеся, калі ласка, да кардыёлага.

***☎ — Асіповічы, Галіна. Муж скардзіцца на болі ў сонечным спляценні. А яшчэ ў яго часта бывае расстройства кішэчніка. Ці можа такія праблемы выклікаць злоўжыванне алкаголем? Аб якіх магчымых захворваннях можа ісці гаворка?***

— Злоўжыванне алкаголем прыводзіць да такога захворвання як панкрэатыт — недастатковасць функцыі падстраўнікавай залозы. Адным з сімптомаў ферментатыўнай недастатковасці гэтай залозы з'яўляецца вадкі стул. Так што цалкам верагодна, што згаданыя праблемы звязаны менавіта са злоўжываннем алкаголем. Адноўчы можа ўзнікнуць і востры панкрэатыт. Характэрнай прыкметай такіх боляў з'яўляецца боль апаясвальны. Ён узнікае ў эпігастрыі і аддае ў спіну. Праўда, захворванне выяўляецца не па адной гэтай прыкмеце, праводзіцца біяхімічнае даследаванне крыві на ўтрыманне амелазы, а ў мачы — дыястазы. У першую чаргу вашаму мужу трэба абследавацца з прычыны панкрэатыту, але трэба памятаць, што боль у эпігастрыі і сіндром раздражнёнага кішэчніка можа выклікаць і язвавая хвароба. Таму трэба будзе зрабіць і фібрагастраскапію.

***☎ — Брэст, Аляксей. Мне 32 гады. Апошнім часам, бывае, пасля ўжывання ежы адчуваю боль, здаецца, у страўніку. Скажыце, ці варта спачатку звярнацца да гастраэнтолага або адразу зрабіць гастраскапію?***

— Любы аб'ём абследаванняў вызначае ўрач. І не абавязкова гастраэнтолаг, дастаткова спачатку звярнуцца да тэрапеўта. Ён можа вырашыць, ці спатрэбіцца кансультацыя больш вузкага спецыяліста. А хутчэй за ўсё, дастаткова будзе і рэкамендацый па абследаванні ад аднаго тэрапеўта...

***— І гастраскапію трэба будзе рабіць?***

— Гэта вызначыць урач. Ёсць катэгорыя пацыентаў, якія любяць абследавацца па ўласным жаданні. Нават часам прыходзяць да ўрача з загадзя праведзеным даследаваннем, якое, дарэчы, можа быць і не так важна для спецыяліста на той момант. Тыя ж ультрагукавыя абследаванні — гэта дадатковыя метады атрымання інфармацыі. На першым плане — аналітычнае мысленне ўрача, правільна сабраны анамнез захворвання, агляд пацыента. Шэраг захворванняў, той жа халецыстыт, напрыклад, нельга вызначыць з дапамогай ультрагуку.

***☎ — Лепель, Аліна. У мяне хранічны халецыстыт. Скажыце, якім павінна быць харчаванне пры такім захворванні? Ці можа яно прагрэсаваць?***

— Хранічны халецыстыт — захворванне жоўцевага пузыра, запаленне яго сценак. Прычын у гэтага стану вельмі многа. Гэта можа быць абумоўлена анатамічнай будовай органа, што прыводзіць да парушэння эвакуацыйнай функцыі, што і выклікае другасны хранічны халецыстыт. У далейшым ён, дарэчы, можа прывесці і да ўтварэння камянёў. Прычынай халецыстыту можа быць і інфекцыя — лямблія ў жоўцевых пратоках. Важны тут і характар харчавання. Вялікія перапынкі ў прыёмах ежы прыводзяць да парушэння функцыі жоўцевага пузыра, паколькі з кожным прыёмам ежы ў нас адбываецца адток жоўці. Частае харчаванне спрыяе добраму адтоку. Пры халецыстыце не рэкамендуецца ўжыванне яек, таматаў, кетчупаў, тлустай ежы.

***— А ці праўда, што некаторыя прадукты несумяшчальныя?***

— Рэкамендацыі па сумяшчальнасці прадуктаў існуюць. Так, садавіну рэкамендуецца ўжываць да асноўнага прыёму ежы, гародніну — з рыбай і мясам, мучное — таксама з гароднінай.

***☎ — Мінскі раён, Святлана Іванаўна. Пралячыла язву 12-перснай кішкі. Доктар параіла надалей, двойчы ў год, з прафілактычнай мэтай ужываць амез. Гэта сапраўды эфектыўны прэпарат?***

— Амез уваходзіць у прафілактыку язвы страўніка і 12-перснай кішкі. Пасля асноўнага лячэння язвавай хваробы рэкамендуецца праводзіць прафілактыку двойчы ў год. 1 таблетка ўвечары, за 30 хвілін да яды, на працягу 2-3 тыдняў. Плюс адвар насення льну. Аднак тым, хто адчувае непрыемныя болевыя сімптомы, але не абследаваўся, каму не выстаўлены дыягназ, праводзіць такую прафілактыку практычна бессэнсоўна. Сутнасць у тым, што язва можа быць абумоўлена мікробам хелікабактар пілары. Калі менавіта ён выклікаў захворванне, то амез будзе неэфектыўны. Абвастрэнне надыдзе вельмі хутка. Так што спачатку трэба абследавацца і пралячыцца, як гэта зрабілі вы.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

*(Працяг будзе).*

# ЖАНІЎСЯ — НЕ ЖУРЫЎСЯ

***Мне 80 гадоў. Тры гады таму ажаніўся. Жонцы 75 гадоў. Да жаніцьбы я жыў у аднапакаёвай нядобраўпарадкаванай кватэры, куды прапісаў і жонку. За час сумеснага жыцця мы змянілі ў кватэры практычна ўсю мэблю, правялі ваду, газ, каналізацыю, размясцілі ў доме прыбіральню. Звонку дом абшылі сайдынгам, пабудавалі прыхожую, сарай і г.д. Цяпер наша жыццё не заладзілася. Я хачу развесціся. Жонка ж гаворыць, што разводу мне не дасць, бо ўклала сюды шмат грошай і яе ўсё задавальняе. Хачу ведаць: якія правы яна мае на дом і на маёмасць? Ці магу я спадзявацца, што пасля разводу яе выселяць з майго дома, бо жыць з ёй стала немагчыма? Удакладняю: у шлюбе мы пражылі 3,5 года. Калі я не змагу яе выселіць, то як адбудзецца падзел жылплошчы, кватэра ж аднапакаёвая? Свайго дома ў жонкі няма, але ў горадзе жывуць яе дзеці, у якіх ёсць і дамы, і кватэры.***

**Р.,** *Гродзенская вобласць.*

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (артыкулы 23-24) вызначана, што маёмасць, нажытая мужам і жонкай у перыяд шлюбу, з'яўляецца іх агульнай сумеснай уласнасцю незалежна ад таго, на каго з іх яна набыта або кім з іх унесены грашовыя сродкі. У выпадку падзелу маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі, іх долі прызнаюцца роўнымі, калі іншае не прадугледжана Шлюбным дагаворам.

Такім чынам, калі Вы з жонкай не заключалі Шлюбны дагавор, то, напрыклад, мэблю, набытую вамі ў час шлюбу, давядзецца дзяліць. Наконт жылога памяшкання (з тэксту пісьма не зусім зразумела, кватэра гэта, ці ўсё ж дом) ёсць тлумачэнне ў пастанове Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 26.03.2003 № 2 «Аб прымяненні судамі заканадаўства пры вырашэнні спрэчак, звязаных з правам уласнасці на жылыя памяшканні». Згодна з пунктам 13 пастановы, жылое памяшканне, якое належыць аднаму з сужэнцаў (мужу або жонцы), можа быць прызнана судом іх сумеснай уласнасцю, калі будзе выканана, што ў перыяд шлюбу за кошт іх агульнай маёмасці або асабістай маёмасці другога з сужэнцаў былі зроблены, у прыватнасці, капітальны рамонт, рэканструкцыя, пераабсталяванне жылога памяшкання, у выніку чаго яго кошт значна павялічыўся. Для высвятлення гэтага пытання суд атрымлівае заключэнне эксперта аб кошце жылога памяшкання да і пасля рамонту, рэканструкцыі, пераабсталявання.

Калі перамены, якія адбыліся з Вашым жылым памяшканнем, сапраўды настолькі кардынальныя, што значна павялічылі яго кошт у параўнанні з ранейшым, і былі зроблены з захаваннем вызначаных заканадаўствам правілаў (атрыманы дазволы ў выпадках, калі гэта патрабуецца, і да т.п.), то суд па іску жонкі можа прызнаць жыллё вашай агульнай сумеснай уласнасцю. Пры гэтым не мае значэння, колькі часу вы знаходзіліся ў шлюбе, галоўнае — за якія сродкі гэта ўсё зроблена: за сумесна нажытыя ў перыяд шлюбу, за грошы жонкі, ці за вашы асабістыя, якія былі назапашаныя вамі да заключэння шлюбу. Калі гэта было зроблена хоць і ў перыяд шлюбу, але за вашы сродкі, назапашаныя раней, то такая маёмасць (у тым ліку дом) раздзелу не падлягае.

Цяпер аб высяленні. Артыкулам 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначана, што члены сям'і ўласніка жылога памяшкання маюць роўнае з ім права карыстання жылым памяшканнем, калі пры іх усяленні не было іншага пісьмовага пагаднення. Калі яны пераселі быць членамі сям'і ўласніка, але працягваюць жыць у гэтым жылым памяшканні, яны захоўваюць свае правы і абавязкі, калі іншае не вызначана Жыллёвым кодэксам і заключаным з імі пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем.

Высяленне членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія не маюць права ўласнасці на долю ў жылым памяшканні, у адпаведнасці з артыкулам 120 Жыллёвага кодэкса, можа адбывацца ў судовым парадку на падставах, прадугледжаных артыкулам 39 Жыллёвага кодэкса (за сістэматычнае разбурэнне ці псаванне жылога памяшкання, выкарыстанне яго не па прызначэнні, сістэматычнае парушэнне правілаў карыстання жылым памяшканнем), або на падставе пісьмовага пагаднення пры ўсяленні, якое не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Калі члены сям'і ўласніка маюць у гэтым населеным пункце іншае жылое памяшканне, што належыць ім на праве ўласнасці, то па патрабаванні ўласніка яны падлягаюць высяленню ў гэта жылое памяшканне. Таксама яны могуць быць выселены па патрабаванні ўласніка ў жылое памяшканне, набытае ім за кошт уласных сродкаў.

Наяўнасць у жончыных дзяцей сваіх кватэр і дамоў не падстава для высялення яе пасля разводу да дзяцей. Гэта магчыма толькі пры наяўнасці згоды як яе, так і яе дзяцей.

Калі ж суд па іску жонкі прызнае жыллё вашай агульнай сумеснай уласнасці, то выселіць яе будзе практычна немагчыма, паколькі ўласнік мае права жыць у памяшканні, якое яму належыць.

У адпаведнасці з артыкулам 246 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь на агульную маёмасць можа быць прызначана долевая ўласнасць удзельнікаў сумеснай уласнасці па іх узаемным пагадненні, а пры недасягненні пагаднення — па рашэнні суда.

Карыстанне жылым памяшканнем, якое знаходзіцца ў агульнай долевай уласнасці, адбываецца са згоды ўсіх удзельнікаў агульнай долевай уласнасці. Пры недасягненні згоды кожны з удзельнікаў агульнай долевай уласнасці мае права патрабаваць у судовым парадку выдзялення яму ў карыстанне ізаляванага жылога пакоя. Таксама ўласнікі маюць права раздзяліць жылое памяшканне з утварэннем двух (або болей) асобных жылых памяшканняў. Для гэтага патрэбны наяўнасць тэхнічнай магчымасці зрабіць такі падзел, дазвол мясцовага выканаўчага і распарадчага органа на пераўладкаванне і перапланіроўку жылога памяшкання, узаемная згода ўласнікаў, а пры яе адсутнасці пытанне можа быць вырашана ў судовым парадку. (Артыкулы 117, 119 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

Калі Ваш дом (ці кватэра) будзе прызнаны агульнай сумеснай уласнасцю Вас і Вашай жонкі, то пры падзеле маёмасці жылое памяшканне можа быць перададзена судом Вам — пры згодзе жонкі на атрыманне грашовай кампенсацыі за яе долю ў праве ўласнасці на жылое памяшканне (калі пры гэтым суд атрымае ад Вас доказы наяўнасці грашовых сродкаў, неабходных для выплаты гэтай кампенсацыі), або пакінута ў Вашай агульнай долевай уласнасці.

Выплата грашовай кампенсацыі замест выдзялення долі, згодна з артыкулам 255 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, дапускаецца толькі са згоды ўдзельніка долевай уласнасці.

Разам з тым, калі доля Вашай жонкі ў жылым памяшканні будзе нязначная, не можа быць рэальна выдзелена і яна не мае істотнага інтарэсу ў выкарыстанні жылога памяшкання, то па Вашым іску суд мае права перадаць Вам гэтую долю з выплатай жонцы грашовай кампенсацыі (пры пацвярджэнні наяўнасці грашовых сродкаў, неабходных для выплаты гэтай кампенсацыі). Кошт долі будзе вызначацца Вашым агульным пагадненнем, а пры адсутнасці такога пагаднення суд мае права прызначыць экспертызу.

Пытанне аб тым, ці з'яўляецца доля ўдзельніка нязначнай, вырашаецца шляхам параўнання агульнай плошчы жылога памяшкання і памеру долі ўласніка.

Наяўнасць або адсутнасць істотнага інтарэсу ў выкарыстанні жылога памяшкання вызначаецца ў кожным канкрэтным выпадку з улікам памеру долі ўласніка ў жылым памяшканні, забяспечанасці яго іншым жыллём і іншых абставінаў, якія заслугоўваюць увагі. Наяўнасць свайго жылля ў дзяцей жонкі не з'яўляецца вызначальнай, бо гэта жыллё не яе. Калі суд прыйдзе да высновы, што доля жонкі ў жылым памяшканні нязначная, не можа быць рэальна вылучана, але жонка мае істотны інтарэс у гэтым жылым памяшканні, то яна не можа быць пазбаўлена сваёй долі ў праве ўласнасці на жылое памяшканне.

## ЯК МІНІМІЗАВАЦЬ НАСТУПСТВЫ АД СУСТРЭЧЫ З ПАНДЭМІЧНЫМ ВІРУСАМ ГРЫПУ?

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя агучыла рэкамендацыі па прымяненні супрацьвірусных прэпаратаў пры лячэнні пацыентаў, інфіцыраваных вірусам пандэмічнага грыпу A/H1N1.**

Асаблівая роля ў папярэджанні развіцця ўскладненняў і наступлення смерці адводзіцца прымяненню двух прэпаратаў — асельтамівіру і занамівіру .

Эксперты СААЗ канстатуюць, што ва ўсім свеце ў большасці пацыентаў, інфекцыяваных пандэмічным вірусам, назіраюцца тыповыя сімптомы грыпу, і поўная папраўка наступае праз адзін тыдзень нават пры адсутнасці нейкага медыкаментознага лячэння. Пацыентам, у якіх хвароба працякае без ускладненняў, не патрабуецца лячэння супрацьвіруснымі прэпаратамі. У той жа час пацыентам, у якіх маюцца хранічныя захворванні, якія павышаюць рызыку развіцця больш цяжкай хваробы, СААЗ рэкамендуе лячэнне асельтамівірам ці занамівірам. Каля 40 працэнтаў цяжкіх выпадкаў працякання грыпу A/H1N1 рэгіструюцца сярод дзяцей і дарослых без хранічных захворванняў, часцей за ўсё ва ўзросце да 50 гадоў. У некаторых з гэтых пацыентаў назіраецца раптоўнае і вельмі імклівае пагаршэнне іх клінічнага стану, звычайна на 5-ы ці 6-ы дзень пасля з'яўлення першых сімптомаў захворвання. Лячэнне такіх пацыентаў павінна адбывацца ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі.

***Неабходна быць пільнымі, каб не прапусціць з'яўлення сімптомаў, якія сігналізуюць аб развіцці больш цяжкай хваробы — праблемы з дыханнем, пасіненне, кравяністая макрота, боль у грудзях, змяненні ў псіхічным стане, высокая тэмпература на працягу больш як трох дзён, нізкі крывяны ціск. У дзяцей сімптомы небяспекі ўключаюць пачашчанае дыханне ці праблемы з дыханнем, зніжэнне актыўнасці, цяжкасці з абуджэннем, а таксама адсутнасць цікавасці да гульні.***

САЗ рэкамендуе неадкладна распачынаць супрацьвіруснае лячэнне дзяцей, стан якіх імкліва пагаршаецца, не чакаючы вынікаў лабараторных тэстаў. Гэта рэкамендацыя адносіцца таксама да цяжарных жанчын і людзей са спадарожнікавымі хранічнымі захворваннямі. Лепшых клінічных вынікаў можна дабіцца, калі распачаць лячэнне на працягу 48 гадзін пасля з'яўлення трывожных сімптомаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## На рынку працы дэфіцыт медработнікаў і лішак юрыстаў

**У Беларусі самымі запатрабаванымі на рынку працы з'яўляюцца работнікі аховы здароўя, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Так, паводле даных на 1 чэрвеня гэтага года, у гарадской мясцовасці зарэгістравана 14 беспрацоўных урачоў, а патрэбнасць у іх — 1194. Для беспрацоўных 23 фельчараў багаты выбар рабочага месца ў гарадах краіны — 222 вакансіі. Прапанаванне ў шмат разоў ніжэйшае за попыт на акушэрак (на 76 вакансій — 4 беспрацоўныя спецыялісты).

У сельскай мясцовасці не хапае 53 урачоў, а сярод сельскіх беспрацоўных толькі 3 чалавекі маюць дыплом аб заканчэнні медыцынскай ВНУ.

У гарадах адчуваецца дэфіцыт выхавальнікаў (269 вакансій, 190 беспрацоўных), інжынераў-электронікаў (адпаведна 69 і 6), інжынераў-канструктараў (72 і 21). У гарадской мясцовасці зарэгістравана 217 беспрацоўных уладальнікаў дыплома юрыста, але патрэбнасць наймальнікаў у гэтых спецыялістах у пяць разоў меншая (42 вакансіі). Прапанаванне ў 4 разы перавышае попыт і адносна эканамістаў — на 133 вакансіі ўмоўна прэтэндуе 561 дыпламаваны беспрацоўны. У спісе працазалішніх прафесій у гарадах знаходзяцца і бухгалтары і педагогі.

У гарадах павышаным попытам у наймальнікаў карыстаюцца вадзіцелі аўтамабіля, муляры, электраманцёры, машыністы бульдозера, экскаватара, цесляры, тынкоўшчыкі і г.д.

Сярод самых жаданых уладальнікаў рабочых прафесій у вёсцы — трактарысты (218 беспрацоўных пры 1180 вакансіях), механізатары (адпаведна 11 і 132), аператары машыннага даення (125 і 567), жывёлаводы (193 і 567). У вёсцы цяжэй за ўсё знайсці работу эканамістам і бухгалтарам.

У сельскай мясцовасці самымі запатрабаванымі спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй з'яўляюцца ветурачы, заатэхнікі, аграномы. Не хапае ў вёсцы і інжынераў (296 вакансій, 77 прэтэндэнтаў).

## Выпускнікі агульнаадукацыйных школ будуць вывучаць у электронным варыянце толькі тры прадметы,

**а астатнія прадметы агульнаадукацыйнага цыкла — па надрукаваных падручніках. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Юрый ГЛАДКОЎ.**

Усе выпускнікі сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў краіны — школ, гімназій і ліцэяў — будуць вучыцца ў адзінацатым штрыхкласе. Гэта тыя юнакі і дзяўчаты, якія ў 2008/2009 навучальным годзе былі ў 9 класе. За гэты навучальны год яны пройдуць праграму 10-га і 11-га класаў. Усе астатнія школьнікі будуць вучыцца па адукацыйнай праграме, разлічанай на 11-гадовую сістэму навучання, без скарачэнняў і пераходаў праз клас.

У гэтым навучальным годзе выпускнікам сярэдніх школ, а таксама выпускнікам гімназій і ліцэяў прапануюцца электронныя версіі па матэматыцы, некаторых замежных мовах і беларускай літаратуры. Па такіх прадметах падручнікі будуць размяркоўвацца як клас-камплект, гэта значыць, што школьнікі будуць карыстацца імі на ўроку, а дома рыхтавацца з выкарыстаннем электроннай версіі падручнікаў «Матэматыка» або «Алгебра і геаметрыя», «Французская мова», «Нямецкая мова», «Іспанская мова», а таксама падручніка па беларускай літаратуры. Плаціць за карыстанне падручнікамі па такой схеме бацькі навучэнцаў не будуць. Кошт за карыстанне камплектам падручнікаў з 1-га па 11-ы клас складзе ў сярэднім ад Br10 тыс. да Br20 тыс. Электронныя версіі падручнікаў будуць размешчаны ў інтэрнэце, на сайце Нацыянальнага інстытута адукацыі. Яны будуць прадастаўлены для свабоднага доступу для скачвання. Таксама ў электронным выглядзе на сайце інстытута можна знайсці дадатковую літаратуру для факультатываў і іншых прадметаў.

# ЯК Я РАБІЛА «ЧЫСТА, ЯРКА І ПРЫГОЖА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— І хто прыдумляе гэтыя новыя ўзоры?

— У нас многа людзей творчых. Наш намеснік дырэктара, напрыклад, які раней працаваў майстрам, прыдумаў да 9 Мая кампазіцыю «медаль», які красуе каля кінатэатра «Аўрора». «Хакеістаў» каля Лядовага палаца прапанаваў наш дырэктар Леанід Борыс, чарцёж праекта зрабілі спецыялісты з «Мінскзелянбуда», афармляла я. Ёсць цікавая кампазіцыя ў Сухарава — «буслы ў небе». Спалучэнне кветак прадумваецца загадзя, яшчэ ў стадыі папяровага праекта, але бывае, прыязджаеш у саўгас — патрэбнай расады няма, тады ідзе замена асартыменту, майстар падбірае на свой густ. Пасадка кветніку таксама ідзе абавязкова пад кіраўніцтвам майстра. У асноўным майстры ў нас працуюць спрактыкаваныя, якія па дзесяць і больш гадоў займаюцца азеляненнем, сабаку з'елі на гэтым...

Самы маштабны ў раёне — кветнік ля «Макдональдса» на плошчы Прытыцкага, які запатрабаваў каля 10 тысяч кветак і тры дні бесперапыннай працы, але затое і радаваць мінчан будзе да канца верасня — пачатку кастрычніка. Зрэшты, гэта калі ўдасца застацца цэлым.

### КРАДУЦЬ УСЁ

Адны саджаюць, другія рвуць, рэжуць ці выкопваюць. І выкрыць тых, то крадзе, амаль немагчыма — не тое што пакараць. Як змагацца? Пытанне рытарычнае. Напісаць ліст у міліцыю і спадзявацца, што пашанцуе. Пару разоў было: дзяжурны міліцыянер у Мінскім райвыканкаме двойчы літаральна за руку схапіў ахвотніка зрываць ружы. Але... крымінальную справу на такога ахвотніка завесці можна, калі шкода зелянбуду нанесеная ў памеры больш як 1,5 мільёна рублёў. Калі менш — у завядзенні справы адмаўляюць. «Аднойчы злавіла наша брыгада на выкопванні расады жанчыну. Прымусілі пасадзіць кветкі назад. А тая смяецца: «Што вы мне зробіце? Ноччу прыйду, сарву што захачу».

— Больш за ўсё крадуць, напэўна, петунію, — прыгадвае Галіна Леанідаўна. — Яе мы часта высаджваем у вазах уздоўж вуліц: яшчэ сёння ваза поўная, а назаўтра, глядзіш — напалову «лысая». Ды ўвогуле, шчыра кажучы, крадуць усё! Незалежна ад крызісу.

Старажылы з брыгады, якая дабраўпарадкоўвае парк імя 60-годдзя Кастрычніка, прыгадваюць: калі парк быў яшчэ зусім малады, высадзілі тут ядловец. А ён не рос, і ўсё тут. І не таму, што няправільна даглядалі — панадзіўся хтосьці з народных умельцаў зразаць яго на пахавальныя вянкі — ці то для сябе, ці, што больш верагодна, на продаж... Незайздросны лёс выпаў і маладзенькім елачкам, у якіх бліжэй да Новага года эпідэмія пад назвай «чалавек знаходлівы» пакасіла ўсе верхавіны.

Цяпер у многіх ужо вялікіх елак верхавін гэтых па дзве — каб не псаваць вонкавы выгляд дрэва, азеляняльнікі рабілі «штучны верх» — падымалі дзве галінкі дагары і прывязвалі да жэрдак. Але затое цяпер у елак новая напасць. Прыбіральняў у наваколлі няма, біятуалеты ставяць толькі на масавыя гулянні, а народ жа збіраецца ў парку кожны вечар. У кусціках не схаваешся — іх паспелі ўжо абстрыгчы і пачысціць; вось і бегаюць наведнікі ў елкі. А самім елкам збегчы няма куды, і яны ад такога абыходжання хварэюць, давядзецца некаторыя ссячы.

Сплюшчаныя ў металічныя аладкі сметніцы, падпаленыя бакі, перацягнутыя ў іншае месца лаўкі — з усімі гэтымі праявамі дурной энергіі зелянбудаўцы сутыкаюцца штодня. Але часцей нават не са шкодніцтвам, а з нядбайным стаўленнем. Выгульваюць гаспадары сабак сваіх гадаванцаў не на пустках, а ў невялікіх скверах ля дома — і вось

*Яшчэ паўгадзіны таму тут быў дрымучы зараснік.*

вам ілюстрацыя жыццёвай мудрасці «вясна пакажа, хто дзе гадзіў». Пажадаюць мясцовыя жыхары скараціць шлях да прыпынку — і праз кветнік пралягае незаслая народная сцяжынка. А потым іншыя жыхары скардзяцца — на сабак, на гаспадароў, на шум касілак, на недахват зэдляў і на агульную забруджанасць любімага месца прагулак.

Пачынаецца ж усё з малога. Вось гарэза 3—4 гадоў з сачком прабягае па клумбе. Азеляняльнікі робяць заўвагу: «Зайчык, тут нельга бегаць, бачыш — кветкі пасаджаныя». А адказныя за малога дарослыя абыякава адказваюць: «Ён выпадкова». Альбо захопленыя размовай мамачкі ўвогуле адмахваюцца з аргументам «этожеребёнок!» Цікава, ці многім чужым дзецям вы дазволіце таптаць уласнаручна ўскапаныя грады і альпійскія горкі? А не сваё — значыць, не шкада?

### КАПАЦЬ АДСЮЛЬ І ДА АБЕДУ

Зелянбуд — арганізацыя з «жаночым тварам». Не, мужчын таксама хапае, але яны ў асноўным занятыя на касьбе, на будаўнічых работах, на барацьбе з баршчэўнікам, пасадках дрэваў, кустоў і г.д. А на працах па доглядзе гарадской зеляніны, ад высаджвання і праполкі кветак да зграбання лістоты і чысткі дарожак — у асноўным жанчыны. На лета, праўда, прыходзіць часовая дапамога: гарадскі Цэнтр занятасці прысылае школьнікаў, якія хочуць падзарабіць, касьбу ўдарна асвойваюць студэнты. Але сярод пастаянных работнікаў цякучкі практычна няма. «Прыраслі каранямі, — жартуюць тыя, хто аддаў прадпрыемству па 20 і больш гадоў. — Дый работа прывычная, можна сказаць, тая ж дача».

— Няўжо і на дачу жаданне і сілы застаюцца? — перапытваю майстроў.

— Ведаеце, і самі дзівімся — на ўсё сілаў хапае, і ўсё ў рост ідзе. Напэўна, тут прыжываюцца толькі людзі, якія сапраўды любяць зямлю і ў якіх лёгкая рука...

Праверыць на справе, ці лёгкая ў мяне рука, не ўдалося — усе кветнікі даўно высаджаныя, цяпер іх толькі праполваюць і паліваюць па неабходнасці. Але далучыцца на дзень да адной з дзевяці брыгадаў ніхто не забараняў.

«Нічога асаблівага не трэба, галоўнае — апраніцеся зручна: напрыклад, красоўкі, спартыўныя штаны і майка ці куртка, у залежнасці ад надвор'я. Калі баіцеся за рукі — гаспадарчыя пальчаткі», — праінструктаваў майстар Ігар Міхайлавіч Галубятнікаў. Назаўтра а восьмай раніцы, адчуваючы сябе няўмелай дачніцай, стаю ля канторы.

Аказваецца, «мая» брыгада ўжо гадзіну як працуе ў парку імя 60-годдзя Кастрычніка. «Нічога вы не прапусцілі, — супакойвае брыгадзір Маргарыта Міхайлаўна Яноўская. — Мы цяпер рыхтуем парк да Дня горада, і працы на ўсіх з верхам хапае». Раніца пачынаецца з абходу — дзве жанчыны збіраюць у мяхі раскіданыя бутэлькі і буйное смецце, за імі наступныя падмятаюць вакол лавак і на заасфальтаваных дарожках. У кожнага свой участак: адны праполваюць кветнікі, другія падстрыгаюць кусты, робячы з дзікага зараснік цывілізаваныя формы, трэція расчышчаюць ад усюдыіснай травы пляцоўку вакол маленькай эстрады. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, што на такіх работах «адзін робіць, а дзесяць раду даюць», ніхто нікому не замінае і не адвільвае пад выглядам перакуру.

— Бо сюды не ідуць ні алкаголікі, ні лайдакі нейкія, што лёгкага хлеба шукае, — тлумачыць брыгадзір. — Ідуць тыя, хто любіць і ўмее працаваць. Многа людзей, хто раней быў заняты на прадпрыемствах. Я сама некалі з завода «Прамень» сюды прыйшла, вось Маша з «Гарызонта» — памятаеце, пасля перабудовы, калі работы амаль не стала, адны заводы вымушаныя былі скарачацца, на другіх людзі сядзелі без зарплаты... А ў мяне муж якраз на «Зелянбудзе» працаваў, ну і я пайшла — думала, часова, ды прыжылася. Цяпер, напэўна, назад і не вярнулася б.

Мяне брыгадзір адкамандзіравала да хлопцаў, якія зграбалі ў акуратныя купкі скошаную траву — потым яе вывезе спецтэхніка. Юнакі да няпрошанай дапамогі паставіліся стрымана, але цалкам прыязна: з граблямі ж прыйшла, не з дыктафонам. Старшы ў групе паставіў задачу: ідзём ад дарогі наверх, да трансфарматарнай будкі. Уключаючыся ва ўдарную працу, спрабую высветліць, як пачуваюцца маладыя людзі на непрэстыжнай і далёка не самай высокааплатнай рабоце. «У нас адзін ходзіць толькі па панядзелках, вось яго, бачна, гэта турбуе — каб хто са знаёмых не заўважыў, — усміхаецца на мае роспыты Віця. Яго самога, які скончыў каледж па спецыяльнасці праваznаўства, прэстыжнасць летняй падпрацоўкі не хвалюе: сюды прыйшоў з цэнтра занятасці, плануе за лета зарабіць на курсы па англійскай мове, каб павысіць свае шанцы ўладкавацца па спецыяльнасці. — Да таго ж графік зручны: а чацвёртай гадзіне мы ўжо вольныя. Я адказаў на ваша пытанне?».

Захапіўшыся, мы не заўважаем, як надыходзіць час абеду. Хтосьці з часовых работнікаў адпрошваецца раней, астатнія збіраюць інвентар і рушаць на перапынак у бытоўку, якая ад парку амаль за квартал. Бытоўка хоць і маленькая, перароблена з былога ЖЭСаўскага памяшкання, але ўсё неабходнае тут ёсць — гардэроб, сталы, крэслы, два электрачайнікі, рукамыйнік, прыбіральня і нават душ. Адзінае, што старыя батарэі не працуюць, таму ўзімку даводзіцца мокрыя рэчы кідаць на сушылку, а самім грэцца за кошт уласнай колькасці... Але зелянбудаўцы не скардзяц

Шануй сваё: ёсць ідэя!

## ПАД КРЫЛАМІ ПЕРАМОГІ

### Да знамянальнай даты — 600-годдзя Грунвальдскай бітвы — засталося мала часу: менш за год. А як мы будзем адзначаць гэты юбілей?

**Перамога над крыжакамі пад Грунвальдам была эпахальнай. Пасля яе Тэўтонскі ордэн неўзабаве прыйшоў у заняпад і ўжо не пагражаў суседнім дзяржавам. І хоць паражэнне было нанесена сумесна з войскам Польскага каралеўства, у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага падобных гераічных падзей бадай што і не было. Гісторыя Вялікага Княства — гэта гісторыя Беларусі. Адзначыўшы перамогу 1410 года, ушанаваўшы подзвіг продкаў, мы адкрылі б паўзабытыя гераічныя старонкі нашай гісторыі, а для станаўлення суверэннай Беларусі — гэта надзвычай важна.**

**У свой час мне давялося ствараць дыяраму Грунвальдскай бітвы для школьнага музея, было гэта яшчэ за савецкім часам ды і маштаб работы быў невялікі.**

**І вось, яшчэ летась у мяне ўзнікла ідэя стварэння помніка Перамогі пад Грунвальдам і нават пачаў працаваць над яго фрагментамі. Але ж манумент на сваім агародзе не паставіш. Вось і вырашыў на старонках «Звязды» паказаць праект-ідэю чытачам нашай газеты. А можа заслугоўвае ўвагі?**

Але хацелася б крыху паразважаць наконт помнікаў.

Кожны мастак (скульптар) хоча, каб яго твор быў калі не шэдэўрам, дык хоць бы арыгінальным і вылучаўся сярод іншых. Але ж тыя помнікі і манументы, як правіла, адлюстроўваюць эпоху, у якой яны ствараліся, і тут немагчыма штосьці змяніць, бо сам мастак — прадукт сваёй эпохі.

Безумоўна, талент мае вялікае значэнне, але даволі часта цяжка пазбавіцца ад стэрэатыпнага мыслення. Напрыклад, паставілі помнік асветніку ці пісьменніку — дык абавязкова з кніжкай у руках, а ўсе князі ў нас з мячамі, узводзім манумент загінулым у мінулай вайне — дык гэта салдат з трохлінейкай ці аўтаматам...

Але гэта мысленне не толькі творцы, але і народа. Людзям усё зразумела — кніжка, меч, вінтоўка, толькі ў часу свой расклад...

На месцы Грунвальдскай бітвы ў Альштынскім ваяводстве палякі паставілі помнік. Адбылося гэта ў 1960 годзе. На гранітным пастаменце вершнік, а наўкол ваяры ды князь з мячом — класічны варыянт.

У сваіх разважаннях я прыйшоў да высновы, што неабходна адысці ад штампаў. Ва ўсякім разе помнік павінен адпавядаць XXI стагоддзю, быць узнёслым — усё ж Перамога.

Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі сімвалам Перамогі была Ніке — крылатая багіня. У рымлян яна стала Вікторыяй, а з прыходам хрысціянства з'явіліся анёлы. Крылы выклікалі захапленне ў людзей, яны прыцягвалі чалавека, узбуджалі яго мары. Калі ўланы атакавалі, то ў іх за спінамі ўздымаліся крылы, а пазней крылы сталі сімваламі авіяцыі, аўтатранспарту, іх выкарыстоўваюць як эмблемы, як таварны знак...

А калі крылы падняць на манумент? І нечакана для сябе ўбачыў, што імклівыя стылізаваныя крылы з сучаснага матэрыялу будуць зіхацець на сонцы — глядзяцца даволі эфектна. Рэзанатары, якія можна ўстанавіць на крылах, пры нават невялікім ветры загучаць (трывожна ці пераможна).

Грунвальдская бітва пачалася з артылерыйскай дуэлі і гармата ля падножжа манумента будзе не лішнім элементам у кампазіцыі. На старадаўняй гравюры ўбачыў эпізод Грунвальдскай бітвы. Уразіла колькасць дзідаў — з двух бакоў. Яны ўздымаліся сцяною — зброя ў тыя часы вельмі папулярная, бо можна было паразіць праціўніка за 4-5 метраў.

Чаму тады агульную кампазіцыю не ўзбагаціць дзідамі — па колькасці харугваў (40 вялікакняжацкіх і 50 польскіх) і на сцяжках выбіць назвы: Слуцкая, Менская, Смаленская, Віленская, Полацкая, Ваўкавыская...

Але вернемся да асноўнага манумента. Два крылы на розных стэлах — гэта звязана з тым, што яны прадстаўляюць усё ж дзве дзяржавы і гэты момант нельга не ўлічваць.

У працэсе работы высветлілася, што форма крыла далёка не кожнай птушкі падыходзіць да кампазіцыі. Найперш, прыдатнымі аказаліся крылы сокала і чайкі — у іх ёсць імклівасць.

Вось так ідэя ператварылася ў макет манумента, але гэта не больш чым мая прапанова. Як мне здаецца, ідэя «не зашмальцаваная» і пры невялікіх фінансавых выдатках яе лёгка можна ажыццявіць.

Безумоўна, тут важнае значэнне мае прывязка да мясцовасці, дзе помнік будзе стаяць. Але гэта ўжо павінны вырашаць архітэктары.

Патрэбна падтрымка ўлады і тады помнік можна будзе ўзвесці агульнымі намаганнямі — узвядзенне яго стане народным.

Наша газета прапаноўвае чытачам абмеркаваць ідэю помніка ў гонар 600-годдзя Перамогі пад Грунвальдам, а магчыма кіраўніцтва аднаго з беларускіх гарадоў, чыя харугва ў той бітве прымала ўдзел, зацікавяцца ім...

Не будзем забываць: «Жыццё кароткае — Радзіма вечная».

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ДАХ НАД ГАЛАВОЙ

**Практычна кожны чацвёрты жыхар сталіцы мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Спісы чаргавікоў растуць хутчэй, чым узводзяцца новыя дамы. Але будаўнічая галіна развіваецца. Калі аб'ездзіце Мінск уздоўж і ўпоперак, убачыце, колькі ў ім «маладых» дамоў і як неверагодна хутка разрастаюцца новыя мікраёны. Два мільёны «квадратаў» у год здаецца ў нашай сталіцы, і калі так будзе працягвацца, у недалёкай будучыні Мінск папросту падвоіцца ў сваім памеры. Што робіцца ў сталіцы, каб як мага большая колькасць людзей атрымала дах над галавой? І якое будзе сучаснае жыллё, што атрымаюць чаргавікі?**

### Хутка, даступна, дастойна

З кожным годам усё больш сацыяльнага жылля будуецца ў нашай краіне. Так, ААТ МАПІД — асноўнае прадпрыемства, якое спецыялізуецца на будаўніцтве жылля для грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў (напрыклад, летась 95 % кватэр «чаргавікоў» створана менавіта гэтай арганізацыяй), з кожным годам нарошчвае аб'ёмы вытворчасці. Летась, напрыклад, МАПІДам уведзена 568 тысяч квадратных метраў жылой плошчы, што складае 235 працэнтаў да ўзроўню 2002 года! Сёлета ж плануецца ўвесці 591 тысячу квадратных метраў жылой плошчы.

Калі вы стаіце на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў і вам паступіла запрашэнне ўступіць у ЖБК ці ЖБПК, якія ствараюцца гарвыканкамам ці ўпраўленнямі камунальнага будаўніцтва раёнаў, значыць, у хуткім часе вы станеце ўладальнікам новай кватэры. МАПІД будуе выключна буйнапанэльныя дамы, што дазваляе ўзводзіць іх круглы год. На некаторых аб'ектах праца вядзецца ў дзве, а то і тры змены. Хуткія тэмпы будаўніцтва на руку заказчыкам, бо іх сродкі засцерагаюцца ад інфляцыі. У сярэднім за 10—12 месяцаў дом ствараецца з нуля да поўнай здачы кватэр пад ключ. І гэта самыя танныя новыя ў сталіцы квадратныя метры.

— Вытворчасць буйнапанэльных дамоў накладае свае асаблівасці на праектнае і планіровачнае рашэнне і адпаведна на матэрыялы і віды апрацоўкі кватэр, — расказвае **намеснік галоўнага інжынера АКТ «МАПІД» Андрэй ШАЛІМА**. — Але сучаснае панэльнае жыллё значна адрозніваецца нават ад таго, што будавалася яшчэ гадоў 10—15 таму. Большасць нашых работнікаў пражываюць у панэльных кватэрах, і нам добра вядомы недахопы ранейшага жылля. Таму мы і мадэрнізуем нашы дамы...

Так у новым жыллі ўжо не будуецца маленькіх кухняў. Нават у аднапакаёвай панэльнай кватэры кухня займае 9,5 квадратнага метра (наогул, плошча кухняў у кватэрах, што будуюцца сёння, складае ад 9,5 да 13 «квадратаў»). У самай масавай серыі дамоў М464-У1, што сёння ўзводзіцца МАПІДам, павялічыць плошчу кухні атрымалася дзякуючы пераходу на будаўніцтва дамоў з крокам 3,2 метра замест 2,6. Дзякуючы гэтаму павялічылася і агульная плошча кватэр, пакоі сталі больш утульнымі.

Другая масавая серыя М111-90 прадстаўлена 19-павярховымі будынкамі. Іх можна пабачыць на вуліцах Карастаянавай, Старавіленскай. Абедзве гэтыя серыі мадэрнізаваныя і адпавядаюць сучасным спажывецкім запатрабаванням.

Асноўныя планіровачныя рашэнні кватэр не памяняліся, што звязана з асаблівасцямі буйнапанэльнага будаўніцтва, бо цвёрдасць будынка базуецца на каркасе, які ствараецца ўнутрысценавымі панэлямі і плітамі перакрыцця. І навасёлы, якія імкнуцца прарэзаць дзвярныя праёмы там, дзе ім уздумваецца, могуць парушаць агульную ўстойлівасць усяго будынка.

Але гнуткая планіроўка магчыма ў дамах серыі М464-М, бо тут у буйнапанэльнае будаўніцтва ўнесены элементы каркаса. У такіх дамах пры ўзгадненні з адпаведнымі інстанцыямі гаспадары могуць трансфармаваць пакоі на свой густ.

У арганізацыі адмовіліся ад прымянення сантэхкабін.

— Раней усё збіралася на заводзе, там санвузлы начыняліся ўсім неабходным, разводзіліся трубы, ставіліся ванны і ўнітазы, пасля гэта прывозілася на будоўлю, дзе як у вялізным канструктары збіралася ў адзін дом, што адпаведна адбівалася на якасці жыллёвага фонду, — расказвае Андрэй Шаліма. — Сёння гэта робіцца ўручную. Раней не было паняцця праект дома, праектаванне і будаўніцтва праводзілася тыпавымі блок-секцыямі, узводзіўся шэраг дамоў-блізнят. Сёння кожны дом індывідуальны, многія з іх з убудаванымі памяшканнямі, што дазваляе знізіць страты на стварэнне інфраструктуры ў новых жылых кварталах.

— Буйнапанэльнае будаўніцтва даволі кансерватыўнае, цяжка паддаецца мадэрнізацыі і ўвядзенню навінак, але ў прынцыпе, змяняць аблічча будынкаў магчыма, — адзначае спецыяліст. — Жыхары гарада могуць бачыць нашы вышынныя дамы з рознымі індывідуальнымі завяршэннямі над машынным аддзяленнем. Першы такі прыём быў прыменены па вуліцы Карастаянавай, і далей гэта атрымала развіццё. Але мы звярнуліся да праектнай арганізацыі, каб неяк упарадкаваць палёт фантазіі архітэктараў і спыніцца на некалькіх варыянтах. Архітэктары — людзі творчыя, але ствараць на дамах кожны раз новую надбудову, — то ў выглядзе шатра, то кароны, — даволі складана. З'яўленне індывідуальных дэкаратыўных элементаў прыводзіць да павелічэння працазатрат, падаўжэння тэрмінаў будаўніцтва і ў выніку падаражэння метра квадратнага. На сёння мы маем некалькі варыянтаў такіх упрыгожванняў дамоў, іх можна пабачыць у раёне Сухарава, Дружба, Вяснянка, — заўважае Андрэй Шаліма.

З цягам часу жыллё стане і больш эканомным — уладальнікам кватэр давядзецца менш траціць на ацяпленне. Дарэчы, МАПІД — першая будаўнічая арганізацыя ў СНД, якая стварыла буйнапанэльны энергаэфектыўны дом. Нават у Еўропе эканомныя дамы, як правіла, невялікія — у 2-4 паверхі, а мінскі будынак дазваляе эканоміць энергію жыльцам, што размясціліся на 9 паверхах.

### Каму гатовенькае?

Сёння жыллё для чаргавікоў здаецца ўжо такім, што хоць адразу расстаўляй мэблю і жыві. Зразумела, калі вы атрымліваеце кватэру з аздабленнем. Якое яно? У кватэрах тыпавых спажывецкіх якасцяў у жылых пакоях на сцяне і столі клеяцца шпалеры, на падлозе — лінолеум, у ванным пакоі і прыбіральні — на падлозе — керамічная плітка, а сцены пакрываюцца маслянымі ці акрылавымі фарбамі. Трэба ўлічваць, што ёсць свая спецыфіка пры ўзвядзенні жылля для льготных катэгорый грамадзян, матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца для ўнутранай апрацоўкі, павінны «ўкладвацца» ў пэўныя рамкі кошту на квадратны метр. Зразумела, у сацыяльным жыллі не будзе дарагога паркета ці нямецкіх шпалераў. Дом будзе начыняцца і даводзіцца да ладу ў асноўным дзякуючы будматэрыялам беларускіх вытворцаў. Плюс — майстры працуюць па дзяржрасцэнках, а знайсці людзей, якія зробяць у вашай кватэры рамонт за невялікія грошы, даволі складана. Акрамя таго, калі раптам што не так, паспрабуй пасля яшчэ адшукай прыватніка, каб выказаць прэтэнзіі. А на гатовае жыллё вам даецца два гады гарантыі.

**«У новым жыллі ўжо не будуецца маленькіх кухняў. Нават у аднапакаёвай панэльнай кватэры кухня займае 9,5 м².»**

А яшчэ трэба заўважыць, што ў першыя гады пасля здачы, дом дае ўсадку і спецыялісты не раяць праводзіць тут дарагога рамонту. Гатовыя кватэры для многіх людзей, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і ўкладаюць усе грошы ў будоўлю, — неблагі варыянт, бо сродкаў на дарагі рамонт не хапае. Я ведаю адну сям'ю, якая брала кватэру без апрацоўкі. Да гэтага часу яна не можа давесці кватэру да ладу і жыве ў пакоях... без шпалераў. Атрымаўшы ключы ад новай «тройкі», яе ўладальнікі напачатку актыўна ўзяліся за абсталяванні ванны і кухні, але атрымалася, што на гэтым усё і спынілася, грошай на далейшы рамонт няма, а ўжо трэба плаціць крэдыт і аддаваць запазычанасць знаёмым. Дарэчы, члены ЖБК могуць уплываць на тое, чым будуць начыняцца кватэры, напрыклад, якія вокны ў іх будуць стаяць. Толькі вырашаць гэта неабходна яшчэ ў самым пачатку, калі складаецца праектна-каштарысная дакументацыя дома.

— А ці адаб'ецца крызіс на сучаснай будоўлі сацыяльнага жылля? — пацікавілася я ў намесніка галоўнага інжынера МАПІДа.

— Мы робім усё магчымае, каб на рашэнні жыллёвых праблем гэта не адбілася, — кажа Андрэй Шаліма. — Асноўная праблема — забеспячэнне праектна-каштарыснай дакументацыі. Даволі часта дакументацыя прадстаўляецца «сырая», недастаткова прапрацаваная, а дом ужо стаіць у праграме на будаўніцтва. Часта адстае і фінансаванне. Ад непрадуманай працы іншых структур церпім і мы, і члены ЖБК. Бо з людзей сабралі грошы, а пасля, калі высвятляецца, што заказчык, ці праекціроўшчык пра нешта забыў, і дакументы трэба дапрацоўваць, людзям прыходзіцца даплачваць, што выклікае незадаволенасць. Часам МАПІД ставіцца ў жорсткія рамкі, мы павінны здаваць жыллё не ў нарматыўныя тэрміны, а ў дырэктыўныя, што, зразумела, можа адбівацца на якасці, усё ж будаўнікам даводзіцца працаваць у больш інтэнсіўным рэжыме. Нам бы хацелася, каб больш рытмічная і прадуманая праца вялася і ў напрамку перспектыўнага планавання. Зараз мы сутыкаемся з сітуацыяй, калі невядома, на якіх аб'ектах будзе весціся далейшае будаўніцтва, а магутнасць прадпрыемства даволі вялікая, і для нас вельмі важна, каб уся тая армія работнікаў у 8600 чалавек, што задзейнічаная цяпер, і надалей была забяспечана працай.

Днямі заехала на адну з новых узводзімых пляцовак з сацыяльным жыллём — Каменную Горку. У 20 гадзін вечара яшчэ працавалі краны і будаўнікі працягвалі «выцягваць» дамы ў вышыню. Ужо сёлета сюды заселяцца людзі: з цесных, змрочных хрушчовак, з перапоўненых кватэр, з чужога жылля, арэнда якога вымывае немалыя сумы з сямейнага бюджэту, яны пераедуць ва ўтульныя кватэры, у малады, чысты, светлы горад.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Кватэрнае пытанне

### КАЛІ МЕТРАЎ НЕ ХАПАЕ

***Мы з дарослым і пакуль не жанатым сынам займаем двухпакаёўку, якая належыць яго бацьку (той і жыве, і прапісаны ў іншым месцы). Ці можа на іншае жыллё разлічваць і сын, г. зн. ці мае ён права стаць на кватэрны ўлік?***

**А. М.**, *г. Віцебск.*

У адпаведнасці з падпунктам 3.1.1 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 года № 565) асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў прызнаюцца грамадзяне, якія не маюць ва ўласнасці або ў карыстанні жылых памяшканняў у гэтым населеным пункце.

Але ў гэтым выпадку ў маці з сынам знаходзіцца ў карыстанні жылое памяшканне, што належыць на праве ўласнасці былому мужу. У адпаведнасці з законам іх правы па карыстанні жылым памяшканнем замацаваныя ў артыкуле 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Калі члены сям'і ўласніка жылога памяшкання перасталі быць членамі яго сям'і, але працягваюць пражываць у гэтым жылым памяшканні, яны захоўваюць свае правы і абавязкі, калі іншае не вызначана заключаным з ім пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем. Такім чынам, нежанаты сын у вызначаным парадку можа быць прыняты на ўлік асобаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі, у прыватнасці, забяспечанасць агульнай плошчай жылога памяшкання (дзе ён пражывае разам з маці) складае менш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека.

**Віктар САВІЦКІ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.05 | 20.17 | 14.12 |
| Віцебск — | 5.52 | 20.09 | 14.17 |
| Магілёў — | 5.55 | 20.07 | 14.12 |
| Гомель — | 5.56 | 20.00 | 14.04 |
| Брэст — | 6.21 | 20.31 | 14.10 |
| Гродна — | 6.26 | 20.29 | 14.03 |

### Месяц

***Першая квадра 27 жніўня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

### Імяніны

***Пр.*** *Антона, Аркадзя, Дзмітрыя, Івана, Пятра.*

***К.*** *Луізы, Людвіка, Рыгора, Юзафа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## НАДВОР'Е на заўтра




## Дзве даты

## 25 жніўня

**1991 год** — Вярхоўным Саветам рэспублікі нададзены статус Канстытуцыйнага закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, прынятай 27 ліпеня 1990 года.

**1919 год** — адкрыўся першы ў свеце рэгулярны міжнародны авіямаршрут Лондан — Парыж.



## Цытата дня:

***«Да жніцьбы ў мяне было шэсць тэорый наконт выхавання дзяцей. Цяпер у мяне шасцёра дзяцей і ніводнай тэорыі».***

**Джон Уілмат.**

## ПАЛЯПШЭННЕ ДАБРАБЫТУ, ПАШЫРЭННЕ РОДУ

**Якія б святы традыцыйнага народнага календара мы не ўзялі, у структуры кожнага з іх яўнай дамінантай будуць рытуальныя дзеянні, абрадавыя песні, магічныя атрыбуты, скіраваныя на рэалізацыю ідэі паляпшэння дабрабыту. Напрыклад, комплекс калядна-навагодніх святкаванняў літаральна наскрозь прасякнуты гэтым сэнсам. Калядоўшчыкі абходзілі кожны двор і жадалі гаспадарам сямейнага дабрабыту, добрага ўраджаю, прыплоду свойскай жывёлы.**

● Нашы продкі свята верылі ў тое, што словы пажаданняў, зычэнняў маюць надзвычай вялікую магічную сілу, асабліва тыя, якія сказаны ў час вялікіх святкаванняў. Яны спадзяваліся: чым больш добрых слоў будзе сфакусавана, напрыклад, у нашых навагодніх пажаданнях, тым больш шчаслівым і спрыяльным будзе ўвесь год.

● У калядныя абрадавай паэзіі мы знаходзім шматлікія пацвярджэнні таму, як нашы продкі малявалі карціну ідэальных уяўленняў аб шчасці, багацці, удачы:

*Прачыстая ідзе, тры радасці нясе:*
*Першая радасць — у тваім доме,*
*Другая радасць — у тваёй аборы,*
*Трэцця радасць — у чыстым полі.*
*У тваім доме — добрыя дзеткі,*
*У тваёй аборы — валы, каровы,*
*У чыстым полі — буйна жыта.*

● Аналагічныя абрадавыя складовыя прысутнічалі фактычна ў розных рытуальна-абрадавых комплексах традыцыйнага календара беларусаў: Масленіца, Юр'е, Вялікдзень, Тройца, Купалле і г.д.

● Аднак праблема паляпшэння дабрабыту ніколі не была для нашага народа самамэтай. Калі звярнуцца да той жа калядная паэзіі, то на першым месцы сярод усіх пажаданняў мы знойдзем натуральнае і заканамернае пажаданне сям'і мець «добрых дзетак». Гэта дазваляе нам зрабіць выснову, што **другім** асноўным прынцыпам традыцыйнай народнай культуры быў **прынцып захавання, працягу і пашырэння свайго роду**.

● Тры складовыя гэтага прынцыпу абапіраюцца на структуру патрыярхальнай беларускай сям'і, у якой **бабуля і дзед з'яўляліся захавальнікамі роду, бацька і маці — яго прадаўжальнікамі, а вось трое дзяцей павінны былі паспрыяць яго пашырэнню**.

● Акрамя таго, бясконцая колькасць прыкмет, пажаданняў, розных прадпісанняў і забаронаў датычыліся маладых на вяселлі. Усе яны былі зарыентаваны перш за ўсё на тое, каб у маладых нарадзіліся здаровыя дзеці:

*«Жадаем, каб у кожным куточку было па **сыночку**,*
*А на кожнай падушцы было па **дачушцы**»,*
*«Дорым вам медзі, каб дзеці раслі, як мядзведзі»,*
*«Дарую бульбы падполле, каб **дзяцей было застолле**».*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

Адэскі Прывоз.
— У вас рыба свежая?
— Вядома!
— А чаго такая крывая?
— На паваросе злавілі!

☺

— Значна горш. Ён больш не зможа піць піва...

☺

**Кухар студэнцкай сталоўкі ходзіць абедаць дадому.**

☺

**«Са мной кашы не зварыш», — памылкова лічыў Джэймс Кук.**

☺

Доктар — жонцы пацыента:
— Падрыхтуйце свайго мужа да найгоршага.
— Доктар, ён памрэ?

# ХАДЗІЎ БАРСІК У «РАЗВЕДКУ»...

Не памятаю такога, каб сусед па лецішчы прыходзіў да мяне з крыўдай. А тут — зайшоў, кашлянуў гэтак шматзначна і паведаміў: «Барсік твой зноў у «разведку» на мае грады прыйшоў...»

Праз хвілінку мы з суседам ужо стаялі каля градкі і цешыліся забаўляльнай сцэнай. Мой гарадскі кот Барсік падпільноўваў бліжэйшага стракатага матыля і скакаў за ім у гарох. Альбо цікаваў за кімсьці толькі яму заўважным і зноў-такі на злом галавы ляцеў праз моркву, цыбулю, кроп...

Свавольніка мы ўтаймавалі, а самі з цікавасцю сталі прыглядацца — хто ж гэта там у зялёных «мікраджунглях» яшчэ хаваецца?

Усё скончылася тым, што вусатаму «разведчыку» была адведзена тэрыторыя на палянцы, а сам я, узяўшы маленькую лічбавую «мыльніцу», пусціўся ў паляванне на насельнікаў хатніх градак. Хачу параіць усім, хто мае такі ж просценькі аматарскі фотаапарат: зазірніце і вы ў найцікавейшы мікрасвет прыроды. Зрабіць гэта вельмі проста — кожны апарат мае у сваім электронным меню каманду «МАКРА» (прасцей кажучы, здымаць з вялікім павелічэннем з малой адлегласці). Уключайце гэтую каманду, трымайце фотаапарат цвёрда, набліжайце аб'ектыў да травінкі і... Толькі не палохайцеся! На вас з экранчыка «мыльніцы» будзе пазіраць і тыркаць вусамі фантастычная істота (звычайная, але моцна павялічаная кузурка).

Здымайце пры добрым асвятленні. Беражыце лінзачку аб'ектыва ад кропель-расінак. Прыглядайцеся да адтулінак у зямлі і каля каменьчыкаў, сухой лістоты, кары старых дрэў — гэта там найчасцей жывуць незнаёмыя нам істоты. І, галоўнае, набярыцеся цярплівасці, бо гэта ўжо ФОТАПАЛЯВАННЕ.

Нездарма ж я свайго Барсіка ў разведку пасылаю!

Паглядзіце на гэтых фотаздымках, як высочвае мой кот-памочнік. Пазнаёмцеся са смаўжом, які заняты сняданнем, і асою, што заляцела пад пялёсткі кветкі. Адгадайце, што за дзіўныя ліхтарыкі зіхацяць на кончыках высоў гароху? Гэта ж кропелькі расы!

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

ЛІТАРАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ ЗВЯЗДА

### ВІЦЕБСК СУСТРАКАЕ ВЕЛАСІПЕДЫСТАЎ, ЗАМЕЖНЫ ПРАЕКТ БЕЛДЗЯРЖКІНО І АДКРЫЦЦЁ НОВАГА ІНСТЫТУТА Ў МІНСКУ

**21 жніўня 1938 года.**

«ВІЦЕБСК, 20 жніўня ў 4 гадзіны дня працоўныя Віцебска сустракалі ўдзельнікаў другога савецкага велатура. Для сустрэчы веласіпедыстаў на аршанскім шасе сабралася больш 1000 працоўных—фізкультурнікаў розных спартыўных таварыстваў. Пад апладысменты прысутных першым фінішаваў спартакавец Букрэеў. Ён з'явіўся пераможцам 12 этапа велатура — Магілёў — Віцебск».

**22 жніўня 1928 года.**

«Белдзяржкандаль прыступіў да экспарту Беларускіх кінофільмаў за граніцу. Ужо накіраваны ў Латвію, Нямеччыну, Польшчу і Данію фільмы «У вялікім горадзе», «Прастытутка». З аднэй з вялікіх нямецкіх фірм «Гом» заключаны дагавор на пастаноў сумесна з Белдзяржкіно двух фільмаў на агульную суму 500.000 залатых марак».

**22 жніўня 1930 года. ВОРША (па тэлефоне ад нашага кар.).**

«Пазаўчора скончыў жыццё самагубствам інспэктар акргандлю — рабочы-вылучэнец т. Юшкевіч. Нябошчык быў вылучаны на адказную савецкую работу рабочымі заводу «Чырвоны Кастрычнік». Прычыны самагубства, па папярэдніх данных — бяздумныя, бюракратычныя адносіны ў апараце АВК да рабочага — вылучэнца. Для расследвання прычын самагубства ў Воршу прыехала камісія ЦК і ЦКК КП(б)Б у складзе т.т. Танхілевіча, Гурэвіча і інш.».

**23 жніўня 1928 года.**

«У Менску адкрыўся інстытут гігіены працы і тэхнікі безапаснасьці. У інстытуце цэлы рад адзяленняў па вывуч. умоў працы на прадпрыемствах тэхнікі безапаснасьці, псыха-тэхнічная лабараторыя і хэмічная лабараторыя аналізаў газаў, паветра і пылу на прадпрыемствах (...) На даабсталяванье інстытуту ў новым бюджэтным годзе мяркуецца выдаць 12 тыс.р.».

**Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.**

Ну і ну!

### НЕ ЎТРЫМАЛАСЯ АД СПАКУСЫ

супрацоўніца Гомельскага райвыканкама па доглядзе пажылых людзей. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 50-гадовай Ш., жыхаркі вёскі Макоўе. З дома 84-гадовай аднавяскоўкі яна выкрала паўтара мільёна рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

**http://**www.zviazda.by;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4608. Нумар падпісаны ў 19.30.**

**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**